Уладзімір Несцяровіч

ПАЧУЦЦІ І ПАМЯЦЬ



Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Уладзімір НЕСЦЯРОВІЧ

ПАЧУЦЦІ І ПАМЯЦЬ

вершы

2023

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Серыя заснавана ў 2023 годзе

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 007

Несцяровіч, У. П.
Пачуцці і памяць : вершы / Уладзімір Несцяровіч. — Мінск : МАА СПБ, 2023. — 123 с. (Электронная бібліятэка).

“Пачуцці” і “памяць” – гэтыя два паняцці, на думку аўтара, у свядомасці чалавека адно без другога існаваць не могуць, нібы легкія і паветра, якімі і чым ён дыхае. Інакш немагчыма адлюстраваць так глыбока, змястоўна і захапляюча тое, што захоўвае памяць паэта.

© Несцяровіч У. П., 2023
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА “Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі”, 2023

Вершы

КНІГА

Пануе кніга ў краіне
З пары закіданых вякоў,
З часоў асветніка Скарыны
Яна знаходзіць сябрукоў.

Вачастых бачыць навучала,
Вушастым слых давала ўсім,
І кніга скрозь дапамагала
Тым, хто з сабой яе насіў.

З ёй беларус вылазіў з цемры
На божы свет, на той прастор,
Дзе набываў аблічча, веру,
Узняўшы позірк свой да зор.

Яшчэ малым сядзеў я дома,
Ды марна часу не губіў,
Хаця чытаць не ўмеў, вядома,
А кнігу моцна палюбіў.

Я рады быў тады нямала –
Жыхар маленькага сяла,
Калі мне ўслых чытала мама
Паэта Вітку Васіля.

Крыху падрос, пайшоў у школу,
Там наталяў сваю душу.
Сабе аднойчы даў я слова:
Таксама кнігу напішу.

І кніга ёсць – на роднай мове.
Вялікі дзякуй тым начам,
Калі з самім сабой у змове
Мой голас творчы загучаў.

МАЯ КНІГА

Яшчэ малым сядзеў я дома,
Ды марна часу не губіў,
Хаця чытаць не ўмеў, вядома,
А кнігу моцна палюбіў.

Я рады быў тады нямала –
Жыхар маленькага сяла.
Калі мне ўслых чытала мама
Паэта Вітку Васіля.

Крыху падрос, пайшоў у школу,
Там наталяў сваю душу.
Сабе аднойчы даў я слова:
Таксама кнігу напішу.

І кніга есць – на роднай мове.
Вялікі дзякуй тым начам,
Калі з самім сабой у змове
Мой голас творчы загучаў.

НАШ СЦЯГ

Сцяг беларускі горды, крылаты –
Сімвал багатай душы беларуса,
Горды, як птушка, што кружыць над хатай,
Сімвал рэспублікі нашай.

Сцяг беларускі, створаны намі,
З колераў трох ён прыкметны здалёку:
Белае поле, строгі арнамент –
Сэрца хвалюе глыбока.

Колер чырвоны, што ў кветках святочных –
Промня гарачага шлях,
Кроў беларусаў – сялян і рабочых,
Што пралілася ў баях.

Колер зялёны на сцягу лунае
Велічна ў гордай красе –
Колер лугоў беларускага краю
Сцяг наш крылаты нясе.

Яркая чырвань і свежая зелень –
У школьніка гальштук такі.
Сцяг наш вялікасны, мы табе верым,
Ты нас абняў на вякі.

РАЗВІТАННЕ З ЛЕТАМ

Адходзіш ты за небакрай,
Бо на двары ўжо верасень,
Бывай жа, лецейка, бывай,
Ды прыйдзе час, ты вернешся.

Цябе з сабою ластаўкі
Паклічуць на зары,
З табою сёння ў час такі
І мы – твае сябры.

Нам сумна будзе трошкі,
У школу ідучы,

Прысядзем на дарожку
З табою, памаўчым.

Але ж мы рады сёння,
У школу ідучы,
З табой для развітання
Усмешку зберагчы.

Адходзіш ты за небакрай,
Бо на двары ўжо верасень,
Бывай жа, лецейка, бывай,
Табе мы верым, вернешся.

НЕБА

Плыве над намі сінява
Ажно кружыцца галава,
Заўсёды шмат у ёй спакою,
Там свеціць сонца залатое.

Ёсць там начныя таямніцы,
Як месяц выкаціцца ніцма,
Пад небам хмары як палотны,
Там журавель – адзін маркотны.

Мяне дражнілі з неба гусі,
Ляцеўшы зноў над Белай Руссю.
У небе думкам спрыт і воля –
Маім. Не прыкмячаў чужых ніколі.

Бывала я, не меўшы сіл,
Да неба рукі ўзнасіў…
У небе нашы ястрабкі
Нямецкіх месераў таўклі.

Таму яго мы бачым розным –
Пахмурым дужа, нават грозным.
Я ў неба дожджыка прасіў –
У ім жа дна няма зусім.

Там усявышняга ўладанні
З часоў сусвету самых ранніх.
У небе шмат і хараства:
Палітра фарбаў мастака.

Каб мне не мець такой прычыны,
Глядзеў бы доўга ў неба шчыра:
Звышгукавы зямны гарэза,
Навошта неба перарэзаў?!

АРЭХАВАЯ РАНІЦА

Рассыплю позірк свой у верасах,
Сахатаму ў вочы шчыра гляну,
Частуй мяне, вавёраччын пасаг –
Арэхамі на сонечнай паляне.

Прымай мяне, лясны зялёны рай,
Пад свой шацёр, дзе фарбы акварэлі.
Не тлей, душа, а полымем палай,
Каб чэрці зубы шчэрылі і млелі.

Успомню тут свае былыя сны:
Зусім даўно, але ўчора, быццам,
Я патанаў у водары лясным,
Я піў яго, баяўшыся напіцца.

Зязюля мне адлічвала гады,
Якіх усё паказвалася мала.

Знаходзіў словы крыўдныя тады,
І птушку ўшчуваў, каб кукавала.

ВЯСЁЛКА

Вясновы дождж як падарунак з неба,
Дык нездарма гаворыць хлебароб:
З ім у маі і аграном не трэба,
Ад Бога зерне вырасце як боб.

Па лужынах ката ганялі дзеці,
Ім басанож зручней, хаця і колка.
І нехта з іх гукнуў далёка дзесьці:
Міхась, глядзі – над возерам вясёлка!

Той захапіўся дзівам незямным,
Яго душа ва ўражаннях спявае –
Вясёлка ззяе ў небе веснавым,
Яна сама, бы радасць маладая.

А бацька хлопца вучыць, як вядзецца:
Зірні, сынок – вакол шчыруюць людзі!
Хлеб сам на стол у доме не кладзецца,
Не папрацуеш – то яго не будзе.

З ПАРЫ ДЗЯЦІНСТВА

Туман расплыўся па траве.
Як пахне вечар сыradоем!
Без солі рыбу ў Кляве
Нептун развёў рачной вадою.

Вада блішчыць, нібыта срэбра,

І месяц скокнуў у раку,
Але ж пасля, каб зноў на неба,
Ды хто падасць яму руку?

А светлячкі ў лузе ціхім,
Нібы агеньчыкі ў начы.
Тут басанож сабе на ліха
Баюся ногі апячы.

СЯСТРЫЧКА

Палата. Не ў роднай мы хаце,
Тут бавім па-іншаму час,
Сястрычка ў бялюткім халаце
Цярпліва вылечвае нас.

Яе пазнаеш ты адметна, –
Жартуючы кажа той-сёй, –
Па подыху свежым паветра,
У палату што коціцца з ёй.

Паглядам сваім папарадку
З нас кожнага бачыць наскрозь,
І ціск падаецца не шаткім,
І спіну не ломіць да слёз.

Нас лечыць і шчырае слова,
Што з вуснаў сястрыных цячэ,
І шпрыц, што падняўся сурова
Над хворым і кволым яшчэ.

Ёй Бог наказаў заручыцца
У тым, што хвароба міне.
Зірнула ў мой бок чараўніца:

Ну, хто там наступны ў мяне?

Над ложкам схілілася лёгка,
З такой бы, здаецца – у вір.
І коціцца кропля за кропляй
У мой арганізм эліксір.

СПЫТАЕ ЗОРКА

Пунцовы захад толькі што паспеў
Нырнуць у сон самоты між галін
Не ўтаймаваўся вечаровы спеў
У засені бярозавых далін.

Дзень адышоў, і што вы ні кажыце –
Прырода ў сне, згасае і зара,
Вунь перапёлка ў недаспелым жыце
Бясконца паўтарае: спаць пара.

Сама ж не спіць і дома не начуе.
У небе поўня – царская манета,
Ускіну позірк толькі, як адчую
Сябе душой бясконцага сусвету.

Няхай мільён і больш вякоў міне,
Але, зірнуўшы на Зямлю-планету,
Спытае зорка холадна ў мяне:
Які дзівак не спіць яшчэ дагэтуль?

КОЦІКІ

Распусціліся раніцай коцікі
Ля ракі на купчастай вярбе,

А твае элегантныя боцікі
Аддаляюць няўмольна цябе.

І паходка твая вяснакрылая
Ўміг пачуцці душы закране.
Азірніся, прашу цябе, мілая,
Пашкадуй небараку мяне.

Коцік ззяе напорыстай сілаю,
Пачынаючы песню вясны,
Азірніся ў мой бок, хуткакрылая,
Забяры мае мары і сны.

…Распускаліся пышныя коцікі,
Усміхаліся сціпла вясне,
Дык чаму твае шпаркія боцікі
Не паверылі ўсё-такі мне?

ОДА ХЛЕБУ

Выходзілі школьнікі ўранні
Туды, дзе гамонка жніва,
Дзе песню спяваюць камбайны
Пра хлеб, што ўсяму галава.

Ад сонца, ад чыстага неба,
Ад свежых бадзёрых вятроў
Водар вялікага хлеба,
Як светлая радасць, сышоў.

За буйны той збожжавы колас,
Наліты чароўным святлом,
Камбайны ў поўны свой голас
У поле ішлі напралом.

Зашкальвае градус за трыццаць,
За бортам яшчэ гарачэй,
Халоднай вадзіцай абмыцца б,
Было б хоць на трошкі лягчэй.

Балюча так, горача твару,
Лютуе спякота, як звер,
У момант, нібы на пажары,
Ад поту макрэе каўнер.

Свядомасць камбайнера маніць.
У скроні пульс горача б'е,
І колас, нібыта ў тумане,
Ізноў у вачах паўстае.

А смог, быццам горшае з ліхаў,
Ізноў прад вачмі паўстае,
Душу ў камбайнера ціха
Да самага дна дастае.

Гарачым паветрам абдаўшы,
Злуецца, выкідвае здзек:
Хлусіш, ты ўтрамацца не зможаш,
Упарты зямны чалавек!

Камбайнеры ў нас не з замежжа,
Такімі і моцны раён,
Трымаюцца ўсе незалежна,
Не возмеш ты іх у палон!

Яны свой характар пакажуць –
Хоць цяжка і млосна, але
Ідуць грамадой экіпажы
За хлеб, што ў нас на стале.

ЗАПАВЕТНАЯ МЯСЦІНА

Бадай у кожнага ў жыцці
Ёсць запаветная мясціна,
Куды не церпіцца прыйсці
Ў любую зручную хвіліну.

А я з паходным рукзаком
Не абміну сваю паляну,
Адкуль бы толькі ні ішоў
Адно сюды загляну.

Мне да яе не шмат хады
Сцяжынай, вымытай расою.
Іду я радасны заўжды
З душой аблашчанай спакоем.

Навокал шчыльныя бары.
Грамы не б'юць маю паляну
І не абсвісваюць вятры,
І не абкрадваюць туманы.

ВАЛЬС ВЫПУСКНІКОЎ

Твой голас пяшчотны і звонкі,
Шмат неба і сонца ў вачах,
Шчымліва апошняй старонкай
Падручніка вальс загучаў.

А вясна цвіце наўкола.
Нарадзіўшыся ў свой час,
Мы ў жыцці, павер нам, школа,
Будзем помніць твой наказ.

Гуляе па Нашай планеце
Ён сёння зусім малады.
І ты прыгажэйшая ў свеце,
І я прыгажун хоць куды!

Душа ў даль імчыцца ракою,
Спявае, здаецца, сама.
Няма ў нашых сэрцах спакою
І меры пачуццям няма.

Злучыў нас з табою ў вальсе
Святочны наш баль выпускны,
Хацеў бы аб тым здагадацца,
Што быццам мы ў свеце адны.

Ў вачах тваіх з бляскам гарачым
Гучаць пазыўныя вясны,
Лаўлю, адчуваю і бачу –
Нікому, а мне ўсе яны.

Пад голас свядомасці ўзнёслы
Плывуць нашы мары і сны,
Мы ўспомнім вас, школьныя вёсны,
Цябе, юны май выпускны.

ЗАРА З ЗАРОЙ

Кіўнецца дня гарызанталь –
Імкліва летні час бяжыць,
Смугой напоеная даль
Напята, стрымана дрыжыць.

Дзянёк ты мой, вяскоўца дбайны,
Не гасне хай твая краса.

Гудзяць нястомныя камбайны,
Пакуль не выпала раса.

Адпрацаваў сваё, і кропка,
Рахунак важкі ў цябе,
Вунь твой напарнік нетаропкі
Вячорак топчыцца ў чарзе.

Зара барвовая, што выткаў,
На небасхіле ўзыйшла,
Пусціў туман увачавідкі,
Саву, каб выкурыць з дупла.

Шчыруе ў лузе драч імпэтна
Парою ціхай залатой,
Ён робіць дратву шыць шчыблеты,
Бо ў вырай ходзіць пехатой.

Зара сама знікаць не хоча,
І не зальеш яе з вядра,
А там насустрач, ад паўночы
Ўстае ўжо новая зара.

Яны, нібыта дзве сястры
Пасля пакут свайго расстання,
Пацалаваліся ўгары,
І настае пара світання.

ШЧУПАК

На вадзе ў віры кавалак неба
Калыхнецца, паплыве ў даль.
Наш рыбак жыве не толькі хлебам,
Чым яшчэ, яго ты запытай.

Не інакш надзея на ўдачу
Кожны раз сюды яго вядзе,
Рыбака заўжды азарт гарачы
Лепш за круг трымае на вадзе.

Надвячорак зноў да ног звaліўся,
Ціха я над рэчкаю стаю,
І шчупак старожка затаіўся –
Небяспеку сцеражэ сваю.

ЛІТАРАТАРУ

У небе сноў, як думкі, ясных,
У царстве вечнасці, камет
Успыхне зорка і пагасне,
Абліўшы зарывам сусвет.

След азараецца на момант,
Сама згасае назаўжды,
А ты, сваёй планеты волат,
Кладзеш глыбокія сляды?

Ты, Чалавек ад нараджэння,
Вынось на споведзь свой сакрэт,
Пакінеш след сваім гарэннем,
За міг, ляцеўшы ў сусвет?

Сказаць што маеш чалавецтву,
Яго шаноўны блудны сын?
Прынёс хоць кнігу з выдавецтва
Сваім нашчадкам на ўспамін?

ГРЫБНАЯ ПАРА

У жніўні я ў каторы раз
Павольнай ціхаю хадою
Іду ў світальны ціхі час
У лес, што дыхае спакоем.

Сваім тугім, бадзёрым крокам
Мяне туды сама нясе
Адлегласць мераная вокам
Знаёмай сцежкай па расе.

Нібы паркет, так мох рыпіць,
У бары я дома, я – герой.
Тут каня ўжо не просіць піць,
Бы ў тую спёку за гарой.

Пара грыбная наступіла,
Душы спакуслівай вясна,
Мне ў лесе хораша і міла,
Нібы ў салодкіх даўніх снах.

Прыйду ў сасновы смолкі бор,
І не пазбаўлены сумлення
Я з галавы здыму ўбор,
Я апушчуся на калені.

КІРМАШ НА ПАЛЯНЕ
(казка)

На галасы лясной паляны,
Не прамінуў я зазірнуць.
Але ж здзівіўся, калі глянуў –
Там весяляцца, там пяюць.

Раней не бачыў столькі звера.
Хоць паляўнічы маю стаж,
Глядзеў, вачам сваім не верыў:
Звярыны сёння тут кірмаш.

Гудзе, гамоніць талака,
На мове голаснай гаворкі
Ляснога дзікага кутка.
Купляюць што, бяруць па колькі?

Лісе – тавар прэстыжнай фірмы,
Такое іншаму не снілась:
Яна ў прымерачнай за шырмай
Хіне да таліі ліслівасць.

Зайцы асобна, між сабой,
(Ім не да твару сарамлівасць)
Ля бочкі з куфлямі гурмой,
Бы квас той глушаць палахлівасць.

Ваўка я ўцяміць не магу,
Драпежнік тут шукае штосьці…
З мяхом уціснуўся ў чаргу
Купіць у краме лютай злосці.

Мядзведзь – ступня як дзедаў лапаць –
Таксама топчыцца ў чарзе,
Ў хадзе стаптаўшы касалапасць –
Кіпцюр у роспачы грызе.

Барсук стаіць тут – морда клінам,
Пры ім маленькіх пакаленне,
І прадавец сваім аршынам
Для іх адмервае сумленне.

Паўзе, спяшае чарапаха
Набыць што–небудзь і сабе –
На спіне панцыр як папаха
І вочы круглыя на лбе.

Чаргі здараецца канец,
Яна праходзіць. І тады
Падаў Тарціле прадавец
Для куплі новыя сляды.

Звяроў тут цьма – да локця локаць,
Тавару ім – на ўсякі густ.
Аб тым, што ўсім пакупак хопіць,
Засведчыць вам ляшчыны куст.

НЕНАПІСАНЫ ВЕРШ

Не напісаны мною вершык,
Як той спалоханы спакой,
Як гнеў душы акамянеўшай,
Як звон някованых акоў,

Свядомасць – толькі без асобы
І без жывога пачуцця.
То плод без матчынай утробы,
Якому не пазнаць жыцця,

Маўклівы крык на цэлы век,
Што заглушае ўсіх жывых.
О, чалавек мой, чалавек! –
Ён як удар пад самы дых.

НЕ ТАЯ ПРЫКМЕТА

У лета – новая прыкмета,
Не тая, што раней была,
Калі я чуў штодня: з імпэтам
Звінелі косы і пчала.

Пяўні спявалі гучна, ліха
Ў двары ў кожненькага з нас,
І пахла пчоламі на ліпе,
І цёк, як мёд салодкі, час.

Шкада, што вёскі ўжо не тыя,
А гэта неяк – не якшы.
Таму і смокча настальгія.
Няма камфоту для душы.

Бывай у вёсцы хоць штодзённа,
Ды асабліва ў выхадны –
Шчыруюць трымершчыкі плённа,
Нібыта тут яны адны.

Працуе трымераў з паўсотню:
Касьба ў кожнага ў двары.
Смурод плыве ў паветры рвотны –
Вось так і лунеш без пары.

З нагоды той у куратоўні
Хоць сам, як певень, закрычы,
Бо мне далёка не ўсё роўна –
У горад хочацца ўцячы.

МЕСЯЦ

Бачыў я, як з неба злазіў.
Хоць і ноч, а ён не спіць.
Месяц, нібы з жарам тазік,
Кане ў рэчку – зашыпіць.

БЯРОЗАВЫ СОК

Спілавалі бярозу вясной,
Больш яна пад вятрамі не гнецца,
Пень як пень, анікому не свой
Заставаўся сядзець на тым месцы.

Закрычалі ўгары жураўлі:
Ты не сын сваёй маці бярозы,
Сын сталёвага звону пілы,
Векавой непазбежнасці слёзнай.

І заліўся ад плачу той пень
Моўчкі, горача, роспачна дужа,
Расцякаўся ў сонечны дзень
Сок бярозавы свежаю лужай.

АБЛОКІ

Заўсёды няўтрымныя хмары
Як людзі, іх думкі, як мары,
Нясеце нястомна куды вы
Адвечны свой голас маўклівы?

Ахопленых панікай, жахам,
Адпетых, аблашчаных страхам,

Затурканых сонным спакоем
Вас гоняць вятры пад канвоем.

Вы хмары, густыя аблокі,
І шлях ваш бясконца далёкі,
Сляпыя блукаеце ў небе
Без мэты, ніякай патрэбы.

Чаму так увосень вам цесна
У гэтай атары нябеснай?
Чаму менавіта ўвосень
Ваш вырай шчымліва галосіць?

Мне бачны маршрут ваш высокі.
Аб тым маўчыцё вы, аблокі,
Што нашая з вамі дарога
Да вечнасці зорнай, да Бога.

ПЯТРУ ПРЫБЫТКІНУ

Вучонаму, краязнаўцу, земляку.

О, чалавек, ты сын сваёй эпохі,
Ты спачыў у царстве светлых сноў.
Бы з дарогі прытаміўся трохі,
Каб устаць – і ў паход ізноў.

Узамен на стоптаныя боты
Не жадаў ты новенькіх лапцей,
Кажуха не ведаў нават потым,
Як мароз пранізваў да касцей.

Усё жыццё у пошуках, паходах
З той пары, са школьных год якраз.
Ты тады з уласнае нагоды

У кнігарні днямі бавіў час.

І што мог, і ведаў, чым валодаў,
Што табе твой лёс падараваў,
Што здабыў у выніку паходаў,
Ты грамадству шчодра перадаў.

Тое дрэва розуму, навукі
І жыцця, і сілы, і надзей
Садзяць сёння ласкавыя рукі
І душа удзячная людзей.

ПРЫГАЖУНЯ

Сёння ты не зусім, як заўсёды.
Нават шчочкі ярчэй, гарачэй,
Не ўтапіцца б мне з гэткай нагоды
У блакіце глыбокіх вачэй;

Па вясне і жыццё маладзее,
Вышыня ружавее нябёс.
Не ўмяшчаецца ў сэрцы надзея,
На цябе спадзяецца мой лёс.

Я прабачу табе нават тое,
Што на свеце ты ўсіх прыгажэй,
Калі сэрца маё супакоіш,
Да мяне станеш трошкі бліжэй.

Не жадаю відовіўшчаў, хлеба,
Згодзен жыць хоць у клетцы, як птах.
Мне наогул нічога не трэба,
Ты прыходзь да мяне толькі ў снах.

НЕВЯДОМЫ САЛДАТ

Бацькам табе стаў замшэлы архіў,
Маці – анкета сухая. –
Праўда паўнюткая моцы, і сіл,
Выхад на волю шукае.

Доўга адмоўчваўся, старац архіў,
Скінуў нарэшце мне папку,
Мовай анкетнай са мной гаварыў,
Выдаў усё папарадку.

Па дакуменце, змарнелым ад сноў,
Па заляжалай анкеце,
Прозвішча, бачна, тваё Іваноў –
Самае гучнае ў свеце.

Хоць на паперы зацёрта імя,
Ты ў невядомасць не кануў,
Кожны з вас, многіх, упэўнены я,
Стаў ахрышчоны Іванам.

Як там па бацьку цябе называць,
Зноўку сказала анкета.
Мовіць яна,ты пайшоў ваяваць
У сорак першае лета.

Ворагі лезлі ў Маскву напралом –
Біўся ты храбра, як рыцар.
У непрытомнасці ўзялі ў палон –
Сам не пакінуў пазіцый.

Ты і ў палоне, салдат, ваяваў.
Зброю здабыўшы ў баі,
Потым з баямі праз вогненны вал

Выйшаў жывым да сваіх.

Вытрымаў допыту прэс асабістаў –
Тыя аддалі ў штрафбат.
Выжыў у пекле смяротным і выстаяў
Цвёрды, як крэмень, салдат.

Клятву даваў ты чырвонаму сцягу
Кропляй апошняй крыві.
Узнагароды – медаль “За адвагу”,
З ёю навечна ў страі.

ЦЯРПЕЎ ПАПІРУС

Цярпеў егіпецкі папірус
І ад халеры, ад чумы,
Калі касіў людзей той вірус
З калыскі самай да труны.

Пергамент вокам–бліскавіцай
Судзіў і катаў, і турму,
Ад гільяцін і інквізіцый
Было аж горача яму.

А зараз вось Каронны гэты,
Адкуль прынёс яго кадук!
Апаясаў сабой планету,
Нібыта спрут, а ці павук.

Лягчэй зрабілася паперы:
Цяпер працуе інтэрнэт,
Трывогу б’е ў поўнай меры
На мове космасу ў свет.

Вякі, вялікія вякі! –
Што век, то зноў вайна і бедства.
Скажы, мой Божа, ў век які
Ўздыхне з палёгкай чалавецтва?

Удзельнікаў мінулай вайны, абаронцаў айчыны, сярод нас застаецца ўсё менш. На жаль, узрост не пашкадаваў таксама і жыцця кавалера ордэна Чырвонай зоркі, ордэна Славы і медаля "За адвагу" У. Наглага з вёскі Ядліна. Але ўдзячная памяць нашчадкаў беражліва захоўвае яго імя. На подзвігах героя ў нас выхоўваюцца наступныя пакаленні.

НА ПАДЗВІГ

Герою земляку

У Ядліне, над ракой Бярозай,
Нарадзіўся, вырастаў, дужэў.
Час настаў пакутлівы і грозны:
Родны край ад бомбаў задрыжэў.

Моцны, мог паборацца хоць з чортам,
Абламаць гатоў і сатану.
З паўналеццем у сорак чацвёртым
Ён байцом паехаў на вайну.

Шлях ягоны быў цераз Еўропу
Праз баі і проста без дарог.
Прабіваўся з мужнасцю, і крокам
Перамогу набліжаў, як мог.

Вызваленне змучаным народам
Кожным днём ён нёс на шынялі,
Гарады прыбалтыкі і Одэр
На шляху ў героя праляглі.

Наглы быў у бітвах не з такоўскіх:
У атаку – хоць з адной гранатай.
Нават сам таварыш Ракасоўскі
Ў ім заўважыў мужнага салдата.

Ён штораз жывым, выходзіў з боя,
З небяспекай зносіўся на ты. –
Загарэўся на грудзях героя
Не апошні ордэн залаты.

Смерці ў твар глядзеў тады нярэдка,
Выйшаў з пекла, вытрымаўшы жах.
Пераправы, бітвы і разведка –
Вось ягоны пераможны шлях.

РАДЗІМА ХЛЕБА

Зямля, што ад Бога
І чыстае неба –
Радзіма святога,
Вялікага хлеба.

Жыццё як сцвярджае
Ды, як павялося,
Наш хлеб нараджаецца
Ў полі з калосся,

Дзе вецер гуляе
Напорыста, смела,

Дзе птушка спявае –
Ад спеваў знямела.

Вясною аралі –
Было так і будзе.
Зямлю засявалі
Руплівыя дюдзі.

Ці ж гэтага мала? –
Вы толькі скажыце, –
Што сонца ўставала
Не ў небе, а ў жыце.

Вам, добрыя людзі,
Пашана за гэта,
Удзячнасцю будуць
Хай вершы паэта.

КУРГАНЫ

У глыбокім сне знямела вечнасць,
Пад ёй стагоддзі заляглі.
Грамады спяць пад шляхам млечным
Глухой ад старасці зямлі.

У курганах эпохі мета,
Але маўчыць раўніва час.
Вось так вякамі з лета ў лета
Хавае тайны ён ад нас.

На курганах усталі дрэвы –
Як лапы звера, карані.
Там вецер–змей спраўляе спевы
Ды ходзіць сонца дзень пры дні.

Ляжыць пад пломбамі дзірвана
Ўся гісторыя вякоў
З пяньковых путаў, ад кайданаў
Да “бранзалетавых” акоў.

БУСЕЛ

Яшчэ і сонца добра не ўзышло,
І вёска ў сне купалася таксама,
А ён ужо спяшаўся за сяло,
Над гарызонтам выруліўшы прама.

Ды пайшоў ля рэчкі на пасадку,
Быццам безматорны самалёт.
Навігатар бусляны ў парадку –
Ён бліскуча скончыў свой палёт.

Часу бусел попусту не бавіў,
Бо яму цяпер не да забаў.
Толькі крылы на спіне паправіў,
Паківаўся ціха паміж траў.

На буслянцы мокры, у расе,
Нават ногі ў чырвонай гліне.
Птушанятам дзюбаю трасе –
Ён вужаку дзеліць паміж імі.

ЁН АБАРОНЦА

Не ваяваў, вайны зусім не ведаў
Школьнік юны – таты, мамы сын,
Вось аднойчы ў час размовы з дзедам
Слухаў ён, як прадзед браў Берлін.

Дзед ягоны на гадоў дзесятак
Перамогі нашай маладзей,
У савецкай арміі салдатам
Мір бярог здабыты для людзей.

Ля мяжы служыў ля той, кітайскай,
Дзе мялеюць воды Усуры,
Дзе тады на востраве Даманскім
Грозныя праходзілі баі.

Бацька – воін у свой час таксама,
Бітву вёў на мытні з анашой,
Адслужыў свой тэрмін ён аддана
І адтуль заслужаным прыйшоў.

Сам юнак, на спадчыну багаты,
Па загаду стаць гатовы ў строй –
Як і прадзед, дзед яго і тата,
Будзе мір ахоўваць і спакой.

НАД БЯРЭЗІНАЙ

Іду, спяшаю раніцай натоліць
Душу, што ноч як вытрымаць змагла.
Ды не праз луг і жаўрукова поле –
Праз сэрца сцежка росная лягла.

Нясу надзею на плячы, як вуду,
Зара ўжо паўнеба заняла.
Куды ні глянеш – раніца паўсюдна,
І над вадою чайка як страла.

На ўсходзе сплаў і золата, і медзі.
Падумаць толькі Божа барані,

Рака бруіцца, хоча папярэдзіць:
“Ты ненарокам цуд не закрані”.

Напэўна, чайцы красці даспадобы –
Бач, на крыле панесла ўдалячынь
Найершы промень, вытанчанай пробы
Туды, дзе ў небе маладзее сінь.

Калі ж найшла вячэрняя пара
І цёмны градус змесціўся на ртуць,
На цёплы плёс з глыбокага віра
Вылазіў сом на зоры зазірнуць.

ПАМЯЦЬ СНОЎ

Блукаюць сны ў вачах бяссоннай ночы,
У тых вачах узрывы навальніц.
Вайна здыхаць пакуль яшчэ не хоча.
Кладуцца воіны – хто дагары, хто ніц.

Крывёю абліваецца пяхота,
Ёй у атаку ўставаць пара,
Узвод застаўся ад стралковай роты
Пасля раскатаў бурнага –“ура”.

Зямля ўжо не здольная гарэць.
З той вышыні, дагэтуль безназоўнай,
Фашыст за кулямётам сее смерць.
Забітым што? Забітым усё роўна,

Наканавана вечна спачываць.
Спакойна там і ціха, як нідзе.
А смерць адна, ёй двойчы не бываць. –
Медаль ужо на грудзі не ўпадзе.

Жывым – наперад, на калючы дрот!
Вось батарэям зараз бы снарадаў,
Каб заглушыць той азвярэлы дзот.
Нарэшце ўзрывы – наша кананада.

РЫБАК

Апантаны ў сваіх надзеях
На раку ён ідзе зімой.
Для яго кожны міг падзея,
Сярод тых, хто на лёдзе – свой.

Эх, які сёння ранак слаўны!
Хоць рыбалка зусім не бой,
Ледабур – пэтээр сапраўдны
На раку ён нясе з сабой.

Рыбаку аніякай справы
Да таго, што зіма, мароз,
Ён не дзеля пустой забавы
На рыбалку сябе прынёс.

Не здакучыць сядзець на лёдзе,
Не астыне душы агонь.
І даніна рыбацкай модзе,
Бы мармышка, злятае ў тонь.

Нерухомы, як лёду глыба,
Толькі думкаю варухне.
Асцярожней сягоння, рыба,
Хоць глыбока ты, хоць на дне.

Прасядзіць тут амаль да ночкі,
Не патрэбен яму ўлоў,

Яго вабіць узрух ківочка,
Што застыў, як імгненне, зноў

ПАЭТ

Паэт не той, хто рыфму вяжа,
Страляе словам прама “ўлёт”,
Пра гэткіх крытыкі адкажуць:
Ён не паэт, а вершаплёт.

Паэт сапраўдны, бы каваль,
Ён слова кожнае куе.
Таму і моцнае, як сталь,
Таму да сэрца дастае.

Вы толькі аўтару даверце
Перакананні, пачуццё.
Усё яго асоба сцерпіць,
Папера сцерпіць не ўсё.

Яму блакнот, пяро не трэба –
Гартуе думку ў душы,
Яго бліскучай рыфмы срэбра
Нікому ўжо не затушыць.

Душою бачыць, адчувае,
Душой пакутуе, пяе,
Душой сваёю ён палае,
Як сонца, ранкам устае.

Яго душа ў свет адкрыта,
З Гамэрам думкамі – свае,
А той, трубач вякоў забытых,
Насустрач голас падае.

ПАДАРАВАНАЯ ПАЛЯНА

Я, завітаўшы ў салон,
Пралескі ўбачыў на карціне:
Вакол сняжысты белы фон,
А самі кветкі ў фарбах сініх.

Карціна тая – першы сорт,
Яна адзіная, як сонца,
Я на класічны нацюрморт
Глядзеў бы гэтак вось бясконца.

Але ж мастацкі той салон
Не параўнаць з лясной мясцінай,
Куды мяне праз колькі дзён
Прынесла слушная прычына.

Каб сэрца любай пакарыць,
Патрэбны мне былі пралескі,
Але ж ці варта гаварыць,
Як доўга блукаў па ўзлеску?

Калі ж знайшоў, вакол як глянуў,
Сабе пакляўся шчыра я,
Што падарую ўсю паляну,
Табе, каханая мая.

ЛАЗНЯ

Бразнуў засаў, клямка падалася ,
Тут для нас сягоння будзе рай,
Нездарма ж званіў учора Вася:
Прыязджаю, лазню падавай.

І яна, зірні ты, запыхцела,
Выплывае з коміна дымок,
Падаецца, лазня захацела
Як плячо, падставіць мне палок.

Ды скажу вам толькі па сакрэце,
Што іду сюды зусім не мыцца,
Як усе чысцюлі на планеце –
А на свет яшчэ раз нарадзіцца.

ЗНІШЧАЛЬНІК

Яго заўважыць нават нельга,
Не птах – пярнатая маланка.
Ёсць у саколіка пустэльгі
Свая паветраная планка.

Палётам кулі недзе збоку
Рване ў атаку ястрабок.
Ахвяру б’е ў момант вока,
Будзь то шчыгол ці галубок.

Адзін удар – і пуху хмара –
Калі паспееш, то зірні,
Як ён, уносячы ахвяру,
Ужо знікае ў вышыні.

З налёту б’е ў паветры птушку,
Ратунку ёй ужо няма,
Таму такую вось мянушку
Пустэльга носіць нездарма.

ДАМОЎ З ПЕРАМОГАЙ

У вагоне з далёкага краю
Не ўжывецца з такім толькі псіх.–
Быццам хлеба апошні акраец,
Сваю ўсмешку ён дзеліць на ўсіх.

Перамога, перамога,
Да цябе быў цяжкі шлях.
Дарагая перамога
Здабывалася ў баях.

Едзе хлопец з далёкага краю,
Смелым быў на вайне, як нідзе,
Ён пасланец Дзявятага мая,
Ён дамоў перамогу вязе.

У вагоне і сцэны, і гукі,
Ды гармоніка тут не стае.
Неўзабаве, праз сёмыя рукі,
Хтось яму інструмент падае.

Гарманіст тут выводзіць калена
Пра айчыну, пра мілы наш край
Ды аб тым, як запомніла Вена
Пераможны той ласкавы май.

Пераборы выдзелваюць пальцы,
Весялосці тут – хлеба не дай.
У мелодыі чуюцца “Альпы”
І Балгарыі “сіні Дунай”.

ШПАК

Арыгінальнічаў спявак.
Сваёю песняй, як прамовай,
Мяне будзіў, бадзёрыў шпак,
Пасланец раніцы вясковай.

Пакуль не выпусціў свой дыск,
Душу падняўшы ўгору дном,
Не змоўк пярнаты парадыст,
На дрэве старым за акном.

На тым, дзе голле нібы рукі,
Спяваў праслаўлены герой.
Плылі ў ягоных песнях гукі,
Мне ўздымаючы настрой.

Ды пра шпака, сказаўшы гэтак, –
Лічы, нічога не сказаць,
Аднак жа ўразілі паэта
Яго эмоцыі і страсць.

А шпак на раніцу раўняўся
(Астатнім птушкам не ў дакор)
Трашчэў, высвістваў, выстаўляўся
На ўвесь абвешчаны прастор.

Тады я рады быў бясконца,
Была і раніца свяжэй,
Калі той птах абліты сонцам
Спяваў і пёркамі дрыжэў.

ЖАЎРУК

У небе чыстым ні хмурынкі–
Не спадзявайся, не шукай.
Застылі дзіўныя хвілінкі,
Яны не скончацца няхай.

Жаўрук – дзе збожжа каласіцца,
Дзе ў спёку вецер спачывае,
Лятае там і там гняздзіцца
Заўсёды птушка палявая.

Увесь трапечыцца спявак,
Душой маленькаю палае,
Мяне ўражваючы так,
Як быццам, крыльцамі спявае.

У небе, сонейкам абмыты,
Жаўрук і там заўсёды дома,
Ўпадзе каменьчыкам у жыта–
Не адшукаць яго нікому.

У час, калі зазвоніць з неба,
Змаўкае ўвесь птушыны грай.
Жаўрук табе адсыпе срэбра,
Вось толькі шапку падстаўляй.

АПАНЕНТЫ

Пануе спёка летнім часам,
Праезджых смага аж грызе,
Вось і Мірон стаіць за квасам
Сярод такіх жа ў чарзе.

Чаргу туды і дзед наведаў.
Яны за столікам сваім.
Раней Мірон дзядка не ведаў,
Упершыню сустрэўся з ім.

У Мірона позірк – вочы ў вочы,
У дзеда думкі ёсць свае,
Стары аж млее квасу хоча,
Але пакуль яго не п’е:

Адкуль ты, хлопча, ці з далёку?
Чаму ў нашай старане? –
А сам хлапца свідруе вокам,
Ажно да пятак дастае.

Ды той з адказам не спяшаўся,
Нібы не чуў ягоных слоў,
Пасля , жартуючы, спытаўся:
Ты чалавек якіх часоў?

Савецкі я, шчэ з той эпохі.
Тады румяны квас пілі
Зусім за дробязныя грошы,
Цяпер – за цэлыя рублі.

Таму, павер, мне не ўсё роўна,
Сваю эпоху адстаім!–
Аповед выдаў ён змястоўны,
Развёўшы гумарам сваім:

Мы пачыналі, як да слова,
(Цяпер нікому не сакрэт)
З асноў самой перабудовы
Назад таму шмат зім і лет.

Паслухай, брат, калі цікаўны,–
Сказаў дзядок, адпіўшы квасу,
Перабудову ўсе віталі
Як новы, свежы подых часу.

Але ж ці мог тады ўявіць
Хоць хтосьці з нашае краіны,
Што ўспыхне ў момант і згарыць
Саюз Савецкі, як пярына.

Нібы на водах Лаперуза,
Дзе караблі ў шчэпкі трушчыць,
Развал вялікага Саюза
Адбыўся раптам у Белпушчы.

Цяпер не вучым мы асноў
Тэорыі марксізма,
Не пішуць нам узнёслых слоў:
Пра шлях да камунізма.

Маральны кодэкс – быў такі,
Для нас гучаў малітвай,
Рэдагаваны на вякі,
Ён дзейнічаў, як брытва.

Рубель з далярам мог спрачацца
І паважаў капейку цэнт,
Мінгандаль праз кааперацыю
Гарантаваў стабільнасць цэн.

Калі што-небудзь даражэла,
Не шкадавалі грошай кроўных,
Душа ні ў кога не дрыжэла,
Бо то ж – “па просьбе ўсіх працоўых”.

Гучалі ў песнях пяцігодкі,
Што мелі поспех у краіне,
Штодзень адлічваючы крокі
Ажно да сопак Сахаліна.

Пад сцягам з зоркай залатой
Вучоны і рабочыя
На працу, быццам бы ў бой
На ратны подзвіг крочылі.

Для нас цары і каралі –
Ўсе ворагі марксізма.
Тады, лічы, што мы былі
За крок да камунізма.

Калі Мірон даслухаў дзеда,
Прамовіў ціха, проста так,
Між іншым, быццам на паследак
І свой уставіўшы “пятак”:

Наперад вас тады вялі –
Лаяльных і капрызных,
Але ж ці верылі ў Крамлі
У “шлях да камунізма”?

Суддзя ўсяму вялікасць час,
Так лёс Саюза склаўся, –
Закончыў той, дапіўшы квас,
І з дзедам развітаўся.

ВЯСНОВЫМ ДНЁМ

Ад сноў зацятых, ад хвароб
Нарэшце час нам пазбаўляцца,

Вунь, як руплівы земляроб,
Што бачыць шчасце толькі ў працы.

Як сонца наша, што ўстае
І свеціць нам, і шчодра грэе. –
Таму заўсёды Бог дае,
У каго палетак зарунее.

У каго далоні ў мазалях,
Ад працы лоб заўсёды мокры,
У таго і колас у палях,
Буйны і важкі, і ўмалотны.

ПЕРАД НАВАЛЬНІЦАЙ

Чутна мне духмяных траў дыханне,
Урачыста ў небе, як нідзе,
Цішыня са мною на спатканне
Ясным днём жаданая ідзе.

Ля ракі ў лазе жаўцее лотаць,
Ластаўка снуе туды–сюды,
Баючыся цішыню спалохаць,
Набірае ў дзюбачку вады.

Таямніча тут неверагодна,
У задуменні незямная раць,
Пацямнела нібы ў прыгасподняй,
Усяго што свечкі не гараць.

Ціша Зеўсу больш не да спадобы,
Бог, відаць, у гневе на яе,
Хмурыць ён свае сівыя бровы,
Крэсіва з кішэні дастае.

Цацку тую сціснуўшы ў жмені,
Ён тады са злосцю ўсіх багоў,
Пекануў ураз па сінім крэмні
Так, што неба выйшла з берагоў.

БАБІНА ЛЕТА

За полем ціхім, з лета голым –
Удалячынь адно зірні:
Там гарызонт вісіць, як полаг,
Яшчэ аблокі ў вышыні.

Над ржышчам рыжым у паветры,
Якое срэбрам зіхаціць,
Праз шмат няблізкіх кіламетраў
У свет павуціначка ляціць.

Для дзесяці асенніх дзён
Прыродай ласкава сагрэтых
Ірдзее нават сумны клён
Парою бабінага лета.

ЗІМОЮ

Застыла прырода ў велічным сне,
А думкі віруюць спантанна
Ды сон аніяк не ідзе да мяне –
Працую над вершам старанна.

Хоць сонца ярчэй, а мароз гарачэй,
У долах снягі, а не росы,
Як хмарна, як замець, то дыхаць лягчэй –
Такія зімой парадоксы.

Дзе вочы прывыклі глядзець на ваду,
У тонях, як рыба клявала,
Па зімніку людзі пайшлі ў Слабаду,
Паколькі бліжэй і цікава.

А з пляжа ўсё-ткі чуваць галасы,
На дзіва там гучна сягоння,
І коціцца рэха далёка ў лясы –
Там лыжнікаў шоу – раздолле.

ГЕРОЙ У ГРАНІЦЕ

Хоць мінула ўжо вёснаў нямала,
Праз пакаленні ўспомніцца снам,
Як па краіне вайна лютавала,
Як перамога давалася нам.

Момант жалобы наплыў нечакана,
Вусны застылі ў малітве ізноў,
Не заціхае душэўная рана,
Сумна нам тут без цябе, Іваноў.

Ты не пачуў, як ударыла куля,
Ды не ўпаў, адышоў у вякі –
Не дачакалася сына матуля
З фронта, як мацеркі многіх такіх.

Не да яе ты вярнуўся з Берліна,
Не да любімай – сказаць камплімент;
Тут, на радзіме, каханага, сына
Моўчкі, ў жалобе, сустрэў пастамент.

І да вянка, што таксама з граніту
Скульптар пакінуў, нібы незнарок,

Многа вянкоў і прынесеных кветак
Легла з пашанай салдату да ног.

Траўнем пакрыты вясновыя далі,
Колькі навокал святла, цішыні! –
Над вышынёй, дзе фугасы стагналі,
Рвуць на кавалкі душу салаўі.

Строй баявы ганаровае варты,
Чуцен выразны гадзінніка бой,
Людзі асобага складу і гарту
Ўвасабляюць твой вобраз, герой.

Старыя раны вярэдліва ныюць,
Вечны агонь, быццам памяць, гарыць.
Бачыў бы ты, што сябры палкавыя
Сёння з табою прыйшлі гаварыць.

Цвёрдая постаць, пілотка, пагоны –
Воін з граніту такі малады.
Слёз не хаваючы , шэпча палкоўнік:
Ты мне даруй, што я выжыў тады.

МЫ АДТУЛЬ

Радзімы сваёй абаронцы
Вярнуліся рана, да сонца,
Вы з каменя, з бронзы, са сталі
У парках, на плошчах паўсталі.

Вы ў кветках, як быццам у пене,
Прад вамі схіляю калені.
Іваны, Сярожы і Пеці –
Вас шмат на удзячнай планеце.

Чаму вы, скажыце, героі,
Навечна застылі ў спакоі?
Адкуль гэта кожны з вас крочыў
Да пастамента аднойчы?

Здалёк мы, з-пад самае Нарвы,
Мы з брустверaў, рвоў і плацдармаў.
Дадому прыйшлі не парадам
З-пад Брэста, Масквы, Сталінграда.

З агня, мы з пякельнага ліха,
Адтуль, дзе з даўна ўжо ціха,
З лагва, мы з варожага краю,
З Берліна, з дзевятага мая.

Адтуль, дзе вайна палыхала,
Дзе нас заставалася мала,
Дзе рэкі крыві і трывога. –
Таму пастаментаў так многа.

ЦАР-ДУБ

Ого, прыродная мясціна,
Дзе лес і верас, і кусты,
Якога волата і сына
Аднойчы нарадзіла ты!

Гадоў асілку больш за трыста –
Увасабляе важны чын
І незалежна, урачыста
Пагляд кідае ў далячынь.

Аброс, як мохам ён, вякамі,
Але пляча свайго не гне,

Кара мацнейшая за камень,
Асколак нават не праб’е.

Праходзяць міма вёсны зімы,
Плывуць стагоддзі ўгары,
Згараюць ранкі ў небасхілах,
Барвовым полымем зары.

Сівой гісторыі равеснік
Не раз сачыў за сцэнай той,
Як уначы кахаўся месяц
З санлівай хмаркай залатой.

І стылым ранкам, на дасвецці
Цар–дуб выходзіў з туману.
Калі ж аб тым пытаўся вецер,
Не вёў ён з ветрам гаману.

Заўжды аднолькава сагрэты,
Не мае ворагаў, сяброў,
Ён сцеражэ свае сакрэты
Ад дзікіх з поўначы вятроў.

ВАЎЧЫЦА

Млечны шлях скамянелы над лесам
Быццам траса ў сусвеце са срэбра.
І на снезе начныя рэфлексы
Як асколкі разбітага неба.

Цішыня ў паветры імгліцца,
Ноч цярпліва адточвае слых,
Углядаецца ў цемру ваўчыца,
Побач трое яе прыбылых.

Варушыліся шэрыя спіны,
Калі тыя ў балоце брылі.
І гарэлі ў слядах журавіны,
Нібы стылыя кроплі крыві.

У баку ад дарог, ад паляны,
Дзе хаваецца днямі імгла,
У балаціне, у багульніку п’яным,
Зграя воўчая спаць залягла.

Егер у форму сваю апрануты,
Усюдыход ветру гнаў наўздагон.
Свой адкрыўшы ў палях першапутак,
Ён з кішэні дастаў тэтефон.

Паляванне – ліхая забава.
Тут удачу бяруць не за хвост –
На ваоў пачалася аблава,
Як сапраўдны лясны “Халакост”.

А стральцу пад сасною пахілай
І мароз дабаўляе спакус,
Страсць гарачая пеніцца ў жылах –
Сам прыбраўся ў белы абрус.

Часу мала мінула ці многа
(Паляванне нібы забыццё)
Ён на мушку ўзяў прыбылога,
Той упаў і крывёю пацёк.

Паляўнічым ніяк не змірыцца,
У замяшанні стральцоўская раць.
Пад флажкі сіганула ваўчыца –
Прыбылых не змагла ўратаваць.

І мацёрая нудна завыла.
У выцці тым без помсты і здзеку,
Што ўсходзіла, нібы з магілы,
Чуўся вечны праклён чалавеку.

ДЗЕД І КОТ

Пяшчотны справа звон калосся,
Як медны гнецца злева бор.
Раней тут чуўся голас вёскі,
Цяпер застаўся толькі двор.

Жывуць у тым двары заўсёды
Яны, вусатыя ўдваіх,
І дзед, і кот. З такой нагоды –
Агульны клопат ёсць у іх.

Той кот – Цімох завецца змалку.
Лепш за любога малайца
Адданы ў доску дзеду Саўку
Ва ўсім, паўсюдна, даканца.

Дзед, як заўсёды, з цыгарэтай,
А кот курыць яе не хоча.
Сядзіць ён побач усё лета,
І толькі моўчкі жмурыць вочы.

Жывуць сабе Цімох і Саўка,
А што ім іншага рабіць? –
Адно, як прыйдзе аўталаўка,
Каб свежай ліверкі купіць.

ХАЛОДНЫ ДЗЕНЬ

Калючы, як дрот франтавой паласы
І шэры, як звера драпежнага цень,
Адметны дажджом ён халодным касым –
Кароткі, як штонікі, восеньскі дзень.

У дзікай прасторы, не маючы дома,
Нібыта знарок звар'яцеў да мяжы,
Кантужаны рэхам магутнага грому,
Ён кожнаму прыкры, усім ён чужы.

Народжаны ў ночы ліхой непагодай
Перадапошні з апошніх надзей
Вандроўнік самотны, памылка прыроды,
Абсвістаны ветрам халодны той дзень.

Басцяўшыся ў пустках, скуголіў і плакаў.
Нарэшце залёг, сутаргава дрыжыць,
Нібыта галодны бадзяжны сабака,
Якому дагэтуль здакучыла жыць.

ЧОРНАЯ ЗАЙЗДРАСЦЬ

На выгляд ветлівы і гарны,
Усмешка круглая, як блін,
Пажым рукі – ціскоў слясарных
І камплімент на ўспамін.

Што да астатняга, то потым,
Калі назаўтра ў кабінет
Пакліча шэф – "падліць кампоту",
Ты выйдзеш скручаны ў рулет.

Затым пабіты, хворы, кволы
І з тварам, нібы зрэбны мех,
Вачмі папросіш валідолу
На паратунак у калег.

ЗВЯРЫНЕЦ

Імчаць машыны наўздагон,
І толькі свішча вецер.
Фургон транзітны, зноў фургон –
Ляціць з-пад колаў смецце.

Груз ехаў не на камбінат,
Не ў нарыхткантору –
У правінцыйны горад. Шмат
Звяроў прывезлі ўчора.

Турма – звярынец перасоўны,
Нявольнік тыгр – і леў, мядзведзь…
Сягоння тут народу поўна –
Майстроў экзотыку глядзець.

А тым наскучыла да краю
Грымасы корчыць дзівакам –
Паніклі малпа з папугаем,
Няма эфекту ад ваўка.

Ён, як усе, на волю хоча –
У лес на вечную вайну.
Яму б разок зімовай ноччу
Павыць у полі на луну.

Прысніцца многім тут савана,
Камусьці джунглі, або стэп,

Жыццё ліхое без падману,
Хоць выпадковы – вольны хлеб.

КРЫГАХОД

Замёр гусіны пералёт
На старце хуткім. Дзень прыбудзе.
З надрыўным стогнам здаўся лёд –
Зімы надломленыя грудзі.

Ды ёй самой, відаць, на згубу
Дзівосны момант настае,
Калі ў неба льдзіна рубам,
Як той нябожчык, устае.

Вада нясе на плынях льдзіны,
Шуміць няспынны крыгаход,
І сакавік – стратэг той дзіўны
Зіме адрэзаў адыход.

Вясна ўсяму жывому трэба, –
Кусае сом свой доўгі вус.
Яго таксама грэе неба.
Рака на нераст крэніць курс.

АБЯЦАННЕ

У спадзяванні я ляжу ў бальніцы
Шмат аўторкаў, пятніц і нядзель,
Ужо не снег, а грому бліскавіцы
Ў акне зіхцяць каторы дзень.

Без мяне зімой блішчэлі лункі,

І не я тады хадзіў на лёд,
Там цяпер шукае паратунку
Веснавы змарнелы крыгаход.

Не мяне вітаюць з неба гусі,
Без мяне бярозавік цячэ
І клякоча заліхвацка бусел,
І глушэц цярэбіцца яшчэ.

Я ўстану з ложка раным рана,
Абяцаю (гэта ж не канец),
Бо вясной ад шлюбнай песні п’яны
Старажытны птах лясны глушэц.

Абяцаю вам сягоння, гусі,
Што спіхну з сябе халодны лёд,
Я ўстану з ложка, я вярнуся
Ўлавіць імклівы ваш палёт.

І табе, знаёмы гучны клёкат
Нашай птушкі, слаўнага бусла,
Што да нас у апусцелы покут
Зноў прынесла бурная вясна.

Я вярнуся, шчыра абяцаю,
Каб на ліха ўсім сваім напасцям
Узляцець над нашым ціхім краем,
Лебядзінай песняю ўпасці.

ДЗЕД МАРОЗ
(у год пацука)

Па трывалым звонкім лёдзе
Праз Бярэзіну раку

Нас вітаць на Новым Годзе
Едзе Дзед на Пацуку.

У кажуху, у пышнай шапцы,
Барада, як шлейф, яго.
У валёнках, зняўшы лапці,
Едзе – знае да каго.

Ён імчыць не выпадкова
Праз глыбокія снягі,
І звініць ажно падкова
Пацуковае нагі.

Дзедаў шлях даўно не новы
У Бярэзінскі наш край,
Шмат асоб тут вартых Слова,
І прырода – божы рай.

Дык сустрэнем госця, людзі,
Гэй, шчаслівая пара!
Свята радаснае будзе –
Дзед Мароз, ура, ура-а!!!

Паэмы

ЭПОХА РУСАЛКІ
(прыгодніцкая паэма)

Адкуль Клява бярэ пачатак? –
Аднойчы ў бацькі я спытаў,
Калі мы пасвілі з ім статак
Сярод густых мурожных траў.

І адказаў мне мудры тата:
– Аб тым здагадваюцца сны.
Адкуль Клява бярэ пачатак,

Ты сам даведайся, мой сын.

Пасля такой яго інтрыгі
Хадзіў я доўга сам не свой.
Дзянькі плылі, як тыя крыгі
Вясновай бурнаю Клявой.

Прыкметна высахла і пойма,
Травіцай свежай парасла,
А я ранейшы, неспакойны –
Душа кіпела і цвіла.

І вось заканчваўся мой шосты,
Калі аднойчы пад урок
Крануў я сябра свайго локцем:
– Ці чуеш ты мяне, Пятрок?

Я план свой горача выкладваў,

Які бярог часіну ўсю
Ў парыве страсці неадкладна
Тут на ўроку Петрусю.

Пасля мяне чакала кара,
Яе чыніла красамоўна
Як промень вострая Тамара,
За ўсіх мацнейшая Пятроўна.

Усёй душой за дысцыпліну –
Выкладчык алгебры сухой
Тады сказала мне: не кінеш –
Век працаваць табе з сахой.

Яна мяне, малога блазна,
Вяла ў настаўніцкую здаць,
А там яшчэ крутую лазню
Паабяцала паказаць.

Лягла на стол і дакладная:
То быццам я сарваў урок.
Дык на мяне Тамара злая –
Шаптаўся ж я, а не Пятрок.

Хвядос Міхайлавіч, дырэктар,
Зацята некалькі маўчаў,
А мне, прызнаюся канкрэтна,
Лягчэй-ма, каб жа ён крычаў.

Была і з завучам “размова”,
Як з тымі, што і да яго.
З нямым нявылітым дакорам
У мой бок зірнуў – не больш таго.

Усе прыгнечана маўчалі,

І нават класны кіраўнік,
Як піянер Марозаў Паўлік,
У падлогу позіркам панік.

Нібы не я – малы кірпаты
І неспакойны, як сарока,
А гэта сам ён вінаваты
У зрыве нашага урока.

Тады сказаў: ідзі, дзіцятка.
Я больш нічога не пачуў.
А сам мяне бы родны татка,
К дзвярам пяшчотна падштурхнуў…

Пасля апошняга ўрока
Я закрычаў нібы вар’ят:
– Мы паплывём, Пятрусь, далёка
Між берагоў, стажкоў і хат!

І нам ужо не да рагатак –
Страляць, палохаць вераб’ёў.
Сярод бабровых ціхіх хатак
Мы неўзабаве паплывём.

Я разумеў: няма рэзону
Дарослых штучкамі злаваць,
Але ў “Палескіх рабінзонаў”
Урок сам вырашыў узяць.

Таму хутчэй, як толькі можна,
Дзяліў сакрэт я з Петрусём:
– За лёс у гэтым падарожжы
Адказнасць самі мы нясём.

Вандроўка наша не для кволых,

Палюе ж хоць твой дзед Піліп?!
Ў яго, ты ведай, ёсць жа порах,
Ды шроту воўчага адсып.

Павер, спатрэбіцца. Дарэчы,
Я прынясу на наш прычал
У рукзаку сваім заплечным
Адмайстраваны самапал.

Х Х Х

Спяшае сонечнае лета
Крывой сцяжынкай да ракі,
Мы ж, апантаныя, з імпэтам
Заняты справай, бы жукі.

А вунь і лодка каля ганка
Чакае моўчкі на двары,
Яе пасля налітай шклянкі
Рыбак нам шчодра падарыў.

Рыбак па прозвішчы Крумкач –
Бабыль вясковы, больш таго,
Даруй, шаноўны мой чытач,
Не паважалі ў нас яго.

Было за што, бо сам Крумкач
На лодцы гэтай браканьерыў,
Тады яе якісь смяльчак
Пашкодзіў трохі грук–сякерай.

Таму рамонту просіць трошкі,
Нібыта нам з Пятром на зло:
У борце не хапала дошкі,
У другім – таксама не было.

Але ж і дно патрэбна ладзіць
Нам заадно, калі ўлічыць,
Што праз яго сабака лазіў
Пад лодку ў спёку адпачыць…

Мы рыхтавалі ўсё з парывам:
Матэрыялы, інструмент,
І калі вам прызнацца шчыра,
То прытаміліся ўшчэнт.

У нас работа так кіпела,
Бы ў тога мудрага Пятра,
Што для Расіі каравелы
Рабіў, лічы, з–пад тапара.

А мы з такім жа вось імпэтам
Рамантавалі свой ”баркас”,
То каб не канула ў лету
Задумка наша па той раз.

У дне, бартах рэстаўраваных,
Дарэчы, шчыліны былі,
Мы іх усе пасля старанна
Кудзеляй туга затаўклі.

Затым у лесе пабывалі –
Была ў тым свая патрэба:
Мы там смалы тады надралі
Ў сасны высокай, аж пад неба.

Чакала тонкая работа
Пасля мяне і Петруся,
Касцёр гарэў ля лодкі потым,
Нібыта смажылі гуся.

Ды не гусём тут пахла справа,
Смалілі лодку – аж раўлі,
З–за гэтай нуднае “забавы”
Балюча рукі папяклі.

Бінтоў баяліся, не бралі,
Тады было не да бінтоў,
Каб дома нас не дакаралі
Хоць проста так за будзь здароў.

І тут паймелі мы навуку,
Пра тое лепей не казаць,
Бо тыдні з два насілі рукі
Ў кішэнях, каб не паказаць.

Але ж не скончана работа,
То зразумела і аслу,
Каб на вадзе трымацца потым,
Нам неабходна па вяслу.

Бяда: балючымі рукамі
Не зробіш вёслаў, хоць памры –
Мы нібы ўспёрліся на камень
Ці апынуліся ў муры.

Х Х Х

Сяло сканчае касавіцу,
Яно жыве на поўны голас,
Ужо малацьба, палёў царыца,
На зуб спрабуе буйны колас.

Нядаўна ліпы адцвілі
І пчолы мёду нанасілі, –
Вы нас паклічаце калі,

Ракі нязведаныя мілі?

Ды наша лодка на вадзе,
На ёй плыві ты колькі хочаш
У падарожжа хоць удзень,
А хоць сярод пахмурай ночы.

Яна ўжо вазіла нас,
Мы шчасце мелі ў ёй катацца,
Ніхто, дарэчы, у той час
З нас не асмельваўся смяяцца.

На лодцы зручна на Кляве,
Яна блішчыць ад фарбы яркай,
Караблік наш цяпер жыве
Пад звонкай назваю “Русалка”.

У промнях сонечных, ты бач,
Заззяла, быццам бы пад лакам.
Аж вочы вырачыў Крумкач,
Калі яе заўважыў раптам.

– Спытаў бы я на гэты раз,
Чыя ў вас лодка, дзеткі?
Вось на такой і я б якраз
У тонях кідаў свае сеткі.

Пятрусь яму тут нагадаў:
– Мы лодку не ўкралі,
Прабач, ты нам яе аддаў,
Дык мы пафарбавалі.

А ён тады ажно ўспацеў,
Ніколькі не здаецца,
Маўляў, спаліць яе хацеў,

Каб хоць адно пагрэцца.

– Ды годзе ўжо ваду муціць,
За борт такі харошы
Вы мне павінны заплаціць
Яшчэ ў дадатак грошы.

Пятрусь тлумачыў, ледзь не плакаў,
І мне было таксама горка,
Ды дзякуй, выручыў сабака,
Які загаўкаў на падворку.

Зароў так моцна ваўкадаў,
Што чутна каля рэчкі,
Нібыта конь яго таптаў,
Ці ўдарылі карцеччу.

Рыбак ураз змяніўся ў твары
(У душы, відаць, выношваў грэх).
Нібыта ўвесь абліты варам,
Ён да двара свайго пабег.

На тым і скончылася ўсё,
Не бачыць і не ведаць,
А мы на той раз з Петрусём
Рашылі не абедаць,

Каб зберагчы каштоўны час.
“У плаванне вам заўтра,
Паўдня ўсяго ў запасе ў вас!” –
Загадвае “Русалка”.

Паўдня ўсяго, а колькі спраў
Рашыць нам прадстаяла,
Хто ў нашу шкуру не трапляў,

Той нам паверыць мала.

Пятрусь дык вуды рыхтаваў,
Рваў яблыкі і дулі,
А я вось бульбы накапаў,
Дабраўся да цыбулі.

Усё, што ў градах падрасло,
Прыдатнае для ежы,
У рукзак паходны наш лягло
У стане самым свежым.

Ды асабліва ад таго
Душа так і плясала,
Як да астатняга ўсяго
Далі нам хлеба, сала.

Узялі сякерку, па нажу
(Складанчыкі, вядома),
Плашчы на выпадак дажджу
Для нас знайшліся дома.

Да юшкі, потым ля кастра,
Прыправы ўзялі трошкі.
– Ну што, Пятрусь, дык нам пара,
Прысядзем на дарожку.

Паходны дзённік адкрываю
Вось тут, на лопасці вясла:
“Мы ў падарожжа адплываем
Сягоння, трэцяга чысла”.

Я запісаў і, загарнуўшы,
У рукзак паходны палажыў,
Які затым крутой падушкай

Мне ночкай цёмнаю служыў.

Х Х Х

Нас у паход праводзіць вёска,
Такое, братцы, ў першы раз,
Таму нязвыкла і няпроста
Нам з Петрусём у гэты час.

І вось за тым вясковым плотам,
Які пралёг праз агароды,
Уздоўж ракі, з–за паварота,
Вітае шчыра нас прырода.

Яна – душы спакуснай нота.
Гэй, прыпыніся, часу бег!
Усё гэта ў дзённік ляжа потым,
Як з лодкі ўстанем на начлег.

Над галавамі свеціць сонца,
Гладышкі тут – рукой падаць,
Вада празрыстая: на донцы
Пясчынка кожная відаць.

– Пятрусь, дык колькі ўжо вякоў
(Паварушы мазгамі смела)
Дно паліруецца ракой,
Каб гэтак радасна блішчэла?

– Ты хваткі, брат, цяпер на жарты,
Мастак, відаць, пакпіць з мяне, –
Такі, як там, за школьнай партай.
А я яму: табе ж відней.

Штораз калышучы вясламі,

Мы па вадзе ўжо доўга ходзім,
Не заўважаем нават самі
Гадзін, што бавім на прыродзе.

Раздолле тут лугам, дубровам
Ўздоўж берагоў ракі прыгожай,
Усё ў фарбах каляровых –
Мы адарваць вачэй не можам.

Пятрусь, глядзі, якое шчасце!
Здаецца, качкі ў трыснягу
У затоку хочуць пахавацца,
Нібыта ў цёмную смугу.

Ды не, дарослая чыранка
Ўзляцела, упала нібы камень,
І, прытварыўшыся падранкам,
Давай цялёпкацца прад намі.

Ты бач, ратуючы дзяцей,
Сабою нават ахвяруе,
А тыя – сотню нам чарцей,
Бы дым, як ветрыкам падуе,

Знікаюць ціхенька з вачэй
У прыбярэжных чаратах,
Ім зручна гэтак і лягчэй,
Яшчэ ж не ўмее лётаць птах.

Ну, чым не танец качанятаў
Паўстаў на момант перад намі.
У паляўнічых жа прынята
Іх клікаць проста лапунамі.

Плывём з вялікім захапленнем.

Дык вось жыве дзе наша шчасце,
Душы вялікае збавенне
Ад суму, сораму, напасцяў!

Цікава нам, што ўбачым потым,
Які малюнак будзем мець,
Што там, за новым паваротам,
Зноў пашанцуе нам сустрэць.

Як для мяне, то ўжо залішне,
О, вока беднае маё! –
На палявым пустым узвышшы
Стаіць старое кладаўё.

Аб тым, што могілкаў баюся,
Пятрусь здагадваўся і так,
На гэты ж раз убычыў, мусіць:
Мой твар зрабіўся бы наждак.

– Чаго дрыжаць і твар, і плечы? –
Пачаў ён жартам даставаць. –
Нябожчык будзе нам дарэчы,
Хоць дапаможа веславаць.

– Навошта могілкі, скажы ты? –
Я запытаў у Петруся, –
Расло б у полі лепей жыта,
Ці ніва добрага аўса…

– Няўжо дагэтуль не ўрубіўся?
Падумай сам, здзіўляцца годзе,
На самай справе ты забыўся?
Паўз іх жа мы ў школу ходзім.

– Эге ж, цяпер я не баюся,

Знаёмы мне такі маршрут,
Я лепш устану, пакланюся,
Бо дзед знаходзіцца мой тут.

А вербы ніцма палягаюць,
Хоць ім так блізка да вады,
Нібы дажджу яны чакаюць
Ці мо таму, што тут клады…

Правей ад могільніку поплаў.
Здаецца мне, рукой падаць,
Але яшчэ нам доўга потым
Было ракою веславаць.

Але нарэшце, калі глянуў,
З–за берагоў крыху вышэй,
Убачыў раптам Любушаны,
Дык не адняць было вачэй.

Прыгожай нам паўстала вёска.
– Цалуй, Пятрусь, царкоўны крыж,
Бо распазнаць зусім няпроста,
То Любушаны ці Парыж.

Мы вёслы ўгору падымаем,
Бо годзе ім ваду чарпаць,
Ад стомы голасу не маем,
Каб Любушаны прывітаць.

Кідаем позіркі наўкола,
Ты, Божа, нас не асудзі,
А вунь на ўзвышшы наша школа,
Яна вітае нас, глядзі!

“На фланг” узялі – баявыя,

Усе яны ўжо сёмы клас.
Вунь Каця, Толя і Марыя…
Як шмат сяброў сягоння ў нас!

Кранальна тут гучаць фанфары,
Арганізавалі ж цэлы фэст,
І мы былі тады ва ўдары:
У гонар нам падобны жэст.

Пасля ўручылі і пакет нам
(Не скажаш: сёмы – дзетвара)
На ім пазначана: “Сакрэтна!
Распакаваць каля кастра”.

Вось развітальныя хвілінкі
(З Пятром нам толькі б не раскіснуць)
У паветры лёгкія хусцінкі,
А хлопцы моцна рукі ціснуць.

Глядзяць у вочы нам адкрыта,
Хоць іх з сабою забяры,
Зайздросцяць, што ні гавары там,
Сягоння трошачкі сябры…

Х Х Х

Не адступаць жа нам ад планаў,
Хоць падарожжа, ды – работа.
Нябачна ўжо і Любушанаў,
Яны – за сёмым паваротам.

З лугоў пацёк вільготны водар,
Паплыў над рэчкай ціхі вечар,
Нас атуліла прахалода.
Пятрусь задумаўся аб нечым.

З якой прычыны, не пытаю,
Яго душа на самым дне,
Сам адчуваю, што знікае
Настрой ранейшы і ў мяне.

– Дык што, Пятрусь, на сёння хопіць?
– Але ж, але! Ужо пара нам, –
Прыкметна ўзрадаваўся хлопец.
З ракі павеяла туманам.

– То чысты бераг выбіраем,
Каб зручна нам было прычаліць,
Ды дроў тым часам назбіраем:
Касцёр ніхто нам не распаліць.

Аднак амаль з паўкіламетра
Нам давялося лодку гнаць,
Пакуль знайшлося тое месца,
“Русалку” дзе прышвартаваць.

Далей было ўсё вельмі проста,
Яшчэ б хто болей бедаваў –
Вунь Рабінзон свой дзікі востраў
З нуля гадамі абжываў.

А гэта – кут лясной прыроды,
Святы і чысты божы рай,
Ты толькі вось з такой нагоды
На ўходзе ногі выцірай.

Ды ў рэшце рэшт, калі прызнацца,
Будзь гэта сказана да слова,
Я не дазволіў бы з’яўляцца
Тут грубіяну, брыдкаслову.

Не толькі з бруднымі нагамі –
Недапушчальна, каб хто йшоў
Сюды з душой з пудовы камень,
З цяжкой, запэцканай душой.

Пад неба тут лясныя шаты
Усталі толькі б нас хаваць
Ад тых дажджоў тугіх, упартых,
Што зверху здольны даставаць.

Вось дуб, стагоддзямі апеты,
Равеснік ён сваіх вякоў.
Каму ж яшчэ свае сакрэты
Даверым сёння з сябруком!

– Пятрусь, глядзі ты, гэта ж сімвал
Краіны нашай – Беларусі,
Ідзі сюды, мы дуб абдымем –
З табою побач станаўлюся.

За рукі ўзяўшыся, з упорам
Мы сталі шчыльна пры камлі,
Ды толькі, мусітка, пяцёра
У абдымкі ўзяць яго б змаглі.

Нішто сабе, дубок дарослы,
Напэўна, ён адзін такі.
Мы да яго падпёрлі вёслы,
Злажылі побач рукзакі.

З кустоў, з-за дрэваў ваўкавата
Сачыў за намі дзікі змрок.
– Аднак жа ён, нямы, патлаты,
Агню баіцца. Га, Пятрок?

Цябе не хочам мы тут бачыць,
Глядзі, хаця б не апякло,
Ляці туды, дзе совы плачуць,
Хавайся ў цёмнае дупло!

Ён задрыжэў азябла ў лісцях,
Затым асклабіўся ганебна,
Пакурчыў рожы – растварыўся
У вышыні начнога неба.

Як у такіх выпадках кажуць,
Змрок уладарыць да пары.
А мы ўзяліся сала смажыць
У час вечаровы пры кастры.

Ды ледзь вады не абпіліся,
Падмацаваўшыся як след,
Тады заўзята ўзяліся
Мы распакоўваць той пакет.

У ім для нас знайшоўся компас,
Ляжалі грошы і пісьмо.
– Чытайма! – крыкнуў я ўголас, –
Аб чым паведаміць яно?

Пятрусь, хутчэй чытай услых!
Я ж слова кожнае лаўлю:
“Вітаем вас, адважных, смелых,
Вы пакараеце Кляву.

Мы любім вас і паважаем”…
З ліста рабілася вядома,
Што грошы гэтыя сабралі
Нам на зваротны шлях дадому.

“…Умова: з лодкай развітацца,
Як з непатрэбнаю нікому”.
Самім параілі дабрацца
Дарожным транспартам дадому.

А лодку потым датараняць
Ужо зусім чужыя людзі,
Маўляў, каб нам праблем убавіць.
Таму і клопату не будзе.

– Дык трэба гэтае пасланне
(Пятрусь пажваў чагосьці ротам)
Цяпер прыняць за прадпісанне
І як загад выконваць потым.

Х Х Х

– Русалку бачыў ты ці не, –
Пятра спытаў я не адразу.
– Аднойчы бачылася ў сне,
Аднак прыгожая, зараза.

– То раскажы, паслухаць хочу, –
Я бы між іншым папрасіў.
– А мо няварта супраць ночы?
Каб ты ў сне не галасіў.

– Я не ўражлівы быў змалку.
– Дык слухай, як такі ахвочы,
Не пра каго, а пра русалку, –
Сказаў Пятрусь, зрабіўшы “вочы”.

Ну і дзівак! Ды больш таго,
У гэты час, я без падвоху,
У вачах гарачых у яго

Мільгнула цэлая эпоха.

З мяне і гэтага хапіла б,
Але Пятра ўжо не спыніць,
Гародзіць так заўзята, з пылам,
Дык гэта праўда, ці маніць?

Пятрусь як быццам з меншым братам,
Каб адпачыць аднойчы ў смак,
Прыйшоў да рэчкі, зухавата
Між дрэў падвесіў свой гамак.

Навокал стомленая ціша,
П'ючы ваду, сапуць каровы,
Пятрусь гамак усё калыша,
Сам задрамаць ужо гатовы.

Бы ў тумане гамак-качалка,
Яго рука не адчувае,
Ды бачыць – тут з вады русалка
Спакойна, ціха выплывае.

Русалка ў вобразе дзяўчыны,
У яе круты, увесь голы, бюст,
А вось ніжэй, ад палавіны,
У лускавінках рыбін хвост.

Сама ад берага ўжо блізка,
Вачасты твар аж дух займае –
Пятрусь сваю гамак–калыску
Ў адчаі позіркам шукае.

А гэта ўжо не гулі ў цацкі,
Блукае позірк, ды дарма,
У грудзях застыла ўсё мярцвяцкі,

Каб крыкнуць – голасу няма.

– Не бойся, твой гамак на месцы,
Ты бач, які прыгожы брацік,
Ад шчасця бацька засмяецца,
А як узрадуецца маці!…

І паказала Петраку.
Дык ён тут ледзьве не самлеў:
Прад ім ягнятка ў гамаку,
Хоць ты нясі яго ў хлеў.

– Што пазіраеш з недаверам,
Ці, можа, браціку не рады?
Яго магу зрабіць я зверам,
А калі хочаш, будзе гадам.

Прачнуўся ўвесь абліты потам,
Нібы вадою з чарпака,
І як узрадаваўся потым,
Што знік гамак, а з ім – рака.

…Усход на небе ружавее,
У нас начлег нібыта ўкралі,
Касцёр наш зыркі толькі тлее,
А мы амаль што і не спалі.

Але Пятрусь як дзіцяня,
Наогул хлопец ён забаўны,
Вунь спіць нібы прадаў каня,
Хоць размаўляў зусім нядаўна.

Я ж палахлівы вось такі,
Нібы начная курапатка,
Ляжу вось тварам да ракі

Ды варушу плячыма зябка.

Блукае позірк па Кляве,
Хоць сам я гэтага не хочу:
А ці русалка не ўсплыве,
Ці да мяне не зарагоча...

Х Х Х

Зноў па вадзе імкне “Русалка”,
Мы з Петрусём у лодцы самі
Плывем упэўнена і шпарка
На вёслах, як пад парусамі.

Плывем праз тоні і брады
Удалячынь па грэбнях хваляў,
Усё туды, усё туды,
Дзе мы ніколі не бывалі.

Нам тут усё цікава, нова,
Як той ля берага чарот,
Як і прыроды нашай слова,
Як рэчкі новы паварот.

А за наступным паваротам
Узнік бярозавы масток,
За ім жа бераг без чароту,
Пад ім як ёсць жаўцяк–пясок.

Уюцца ў небе стрэлы-птушкі,
Затым хаваюцца ў пясок,
Глядзі, Пятрусь, – берагавушкі,
У норцы кожнай іх гняздо.

Які палёту іх парыў!

Яны нас быццам не баяцца,
Тут так і чуецца: шчасліў...
І вам шчасліва заставацца!

Пабачыць шмат нам давялося
За той няпросты водны шлях –
Малюнкаў сціплых і вясёлых
Ды і такіх, што проста жах.

То бераг дзікі, то ён пляжны
Здзіўляе нас ізноў, ізноў,
Аб гэтым дзённік мой раскажа,
Калі мы вернемся дамоў.

І паляўнічыя на качак
Праходзяць вунь паўз чараты,
Ёсць тут ахвочыя рыбачыць,
А там сплаўляе хтось плыты.

На лузе дружна сена косяць,
Шарэнгай стаўшы, мужыкі,
Для іх пагоды ў Бога просяць,
За рукі ўзяўшыся, жанкі.

Прыкметна сонца села ніжай,
Каб залаціць лясныя далі,
У затоку ціхую заплыўшы,
Свае мы вуды разматалі.

Нарэшце іх пазакідалі.
Не шанцавала на лінёў,
Але мы ўсё-ткі нацягалі
На юшку тлустых акунёў.

Няхай раскажа тоўсты дзённік

Пра тое, як пераначуем,
А мы тым часам свой законны
Ласунак – юшку – прыгатуем.

Не трэба нам каманды, знаем,
З чаго пачаць сваю тут кухню,
Рашылі: дроваў назбіраем,
Хутчэй хай полымя ўзрухне.

Ужо і юшка закіпае,
Усё як бы ідзе па плану,
Але ж істотай адчуваю:
Штось падазрона ціха стала.

Замоўкла птушак шчабятанне,
Прырода быццам бы знямела,
І піць не просіць нават каня,
Паветра густа пацямнела.

У небе бліснула маланка.
У гэты момант я пачуў,
(Не дзіўна ж, парыла так зранку)
Загрукатала: г-р-р-р-р, бум, бум-м-м!..

Яшчэ, зірнуўшы раз у неба,
Я зразумеў тады Пятра.
Без слоў дамовіліся: трэба
Аднесці юшку ад кастра.

Пачаўшы хуценька ўпраўляцца,
Не асцярожнічалі мы.
Не мелі права памыляцца,
Ды ў спешцы юшку разлілі.

Зірнуўшы ў вогненнае неба,

Пятрусь мяне развесяліў:
– Бог з ім, з кастром, ён нам не трэба,
Яго ўсё роўна б дождж заліў.

Хто б падказаў, куды падзецца
Ад неспакойнай той стыхіі,
Што навальніцаю клянецца
У гэты час праліцца ліўнем.

– Пятрусь, на гэты раз павер мне,
Бяжым, бо там ратунак наш,
Хутчэй, мы лодку перавернемі –
Пад ёй хавайся, там заляж!

Вятруга гне над намі шаты,
Як з луба дождж раптоўна ўліў,
Пярун ударыў бы з гарматы,
Яліну тут жа падпаліў.

Бяжым, бяжым, нам елка свеціць,
Паспець бы, ой-ё-ё-ё-ёй!
Вось мы ўжо бачым лодку з Пецем,
У наступны момант мы – пад ёй.

І назіраем быццам з дзота,
За ўсім, што робіць дзікі змей,
Пад лодкай нам не так маркотна,
Ды і бяспечней, чым раней.

Цяпер не страшнае і неба,
І нават радуюся я:
Укрыцце – лепшага не трэба,
Ідэя ж з лодкаю мая!

А вецер сілы не збаўляе,

Ён гне яліны перад намі.
Такі бяды навырабляе,
Дастане дрэвы з каранямі.

Пачулі мы страшэнны вэрхал:
На нас алешына лягла.
Удар прышоўся ў лодку зверху –
Як толькі вытрымаць магла!

Але ж мы мелі ў гэтым шчасце,
А вось калі б наадварот,
Дык і ў труну навошта класці,
Як немцы кажуць: “маін Гот!”

Бы на сапраўднай той вайне
Пагібель наша побач з намі,
Мы тут, пад лодкай – у труне,
Аб тым не скажа нават камень.

– Чаго, – крычу, – не лямантуеш?
Лічы, ў магіле я і ты!
Няўжо не бачыш і не чуеш?
Павер, што зараз нам кранты.

– Ды чую, чую, не глухі,
Клянуся прозвішчам і імем:
– Ты спінай толькі варухні,
І нашу лодку прыпадымем…

Трашчаць з натугі пазванкі,
Мяжа магчымасці, вядома,
А лодка як валун цяжкі,
Ляжыць над намі нерухома.

Мы зноў бы мёртвыя маўчым,

Баляць цягліцы, ныюць косці,
І вельмі цяжка на душы
Ў мяне ад крыўды горкай штосьці…

Звярнуўся я да Петруся:
– Мы апынуліся ў пастцы.
У рай спяшаецца душа,
А цела дзеліцца на часткі.

Спантанных думак цэлы рой,
У галаве гучыць пагроза,
І ад няўцешнасці такой
У вачах нагортваюцца слёзы.

Я доўга, доўга моўчкі плачу,
Бо невыказна хочу жыць.
Пятрусь таксама не іначай
У слязах увесь цяпер ляжыць.

А час ад часу не лягчэй.
Мяне нарэшце асяніла:
– Падкоп давай рабіць хутчэй,
Інакш, і праўда, нам магіла.

З-пад лодкі ход я сам раблю,
На боль у пальцах не зважаю,
Пятрусь адсоўвае зямлю,
Святых і грэшных дакарае.

Працую шпарка я, заўзята,
Як крот, вылазячы з нары.
А грунт цяжкі такі. Праклятый,
Не паддаецца, хоць памры.

Я працаваў, ламаў пазногці,

На пальцах скуру сваю рваў,
Бы прагна грабячы кагосьці,
Але цярпеў жа і трываў.

Ужо і сілы пакідаюць,
І дыхаць цяжка, нібы ў нетрах,
У гэты час удушша давіць,
Ад недахопу тут паветра.

Капаў з надзеяй патаемнай,
Хоць і было зусім няпроста,
Але няўжо ўсё дарэмна:
Натрапіў я на корань тоўсты.

Таму капаць мне давялося
Глыбей яшчэ, пад корань той,
Нарэшце мабыць удалося,
Пралезці можна – Божа мой!

– Пятрусь, хутчэй, – спрабую клікаць,
А той мне ціха: не магу,
Вады хачу… вадзіцы б выпіць…
– Хутчэй-хутчэй, дапамагу.

Хацеў хлапца праціснуць першым,
Каб даць паветра Петраку,
Але яго на гвозд хоць вешай.
– Тады я першы, дай руку!..

Мы побач з лодкай нібы трупы –
Хто ўгору тварам , а хто ніц.
Устае усход на небе скупа,
Ні ліўня ўжо, ні навальніц…

Х Х Х

Пасля рабінавай начы,
Што ўчора трэсла дол і дрэвы ,
Мы заклапочана маўчым,
Але жывыя – хто б паверыў!

У шлях рыхтуемся мы дбайна,
Хмяліць душу азона водар,
Якім, наіўных ды адчайных,
Нас частаваў Пярун учора.

Мы зноў у лодачку-гайдалку
Свае ўклалі рукзакі,
Затым прымае нас “Русалка”
На борт над хвалямі ракі.

Бывай, наш слаўны родны бераг,
Цябе запомнім назаўжды,
Не трэба новых нам амерык,
Не трэба іншае вады.

Хаця палову дня праспалі,
Ды аніякае бяды.
Ужо Клявы празрыстай хвалі
Змываюць нашыя сляды…

Здаецца, рыбу ўжо лавілі,
Цяпер так хочацца грыбоў,
Якіх, сказаў бы я, павінна
Шмат нарасці пасля дажджоў.

Вось так аднойчы на світанні
Мы абмяркоўвалі свой план,
Пры тым сур’ёзна вырашалі,
Чым лепш заняцца сёння нам.

Грыбы ў нас! На тым і кропка, –
Рашылі мы на гэты раз,
Тым больш хадзіць жа недалёка,
Бары пры беразе якраз.

Грыбы – вялікае жаданне,
Пульсуе радасць да нябес,
Бы на вялікае спатканне
Мы з Петрусём ідзем у лес.

Пасля паходнай марш–вандроўкі
(Аб тым хоць дзякуй лес маўчыць)
Без папярэдняй трэніроўкі –
Нам давялося адпачыць.

У торбах нашых – ні лісічкі,
Ці я на іх зусім сляпы?
Гудзелі ногі з непрывычкі,
Бы тэлеграфныя слупы.

Ва ўласных думках патануўшы,
З нас кожны стомлена маўчаў.
– Лепш на вадзе там, чым на сушы, –
Пятрусь узрушана пачаў, –

Бо там, у лодцы, на вадзе,
Ніяк не стаптваюцца ногі,
Там гэтак лёгка, як нідзе –
Без стомы нуднай і трывогі.

У час размовы нашай простай
Мы нейкім чынам адпачылі,
Нарэшце ўспомнілі, навошта
Прыйсці сягоння ў лес рашылі.

Але чаму ж няма ў бары
Грыбоў цяперака, у жніўні,
У дні такой грыбной пары,
Пасля густых, вялікіх ліўняў?

– Давайма думаць галавой,
Пятрусь, а мне здаецца,
Належыць нам грыбы з табой
Шукаць у іншых месцах?

– Але ж але, я заяўлю
Аб тым, што й мне карцела,
Дзе сонца лашчыла зямлю,
Грыбніца там паспела.

У мясцінах, дзе расце чабор,
У верасовых месцах.
Выходзім з бору на прастор,
Гайда шукаць узлескі!

Лес прапануе пільным быць,
Уважлівым, як вока,
Каб незнарок не заблудзіць,
Забрыўшы ў гай далёка.

Ды гэта мабыць не пра нас…
Калі ж зірнулі ў неба:
Мы тут нямераны ўжо час,
Спяшаць на базу трэба.

Бяжым праз лес, танцуюць дрэвы,
Навокал шэрая імгла
Нас як і справа, так і злева
Даволі шчыльна апляла.

Усё замгліла, нават неба,
Але ж якія мы разявы!
Цяпер нам компас, компас трэба,
Бо будзе ноч ліхой забавай.

Навошта компас – кожны знае.
Няма з сабой, бо ён у нас
Як рэч нікчэмная якая,
У рукзаку ў гэты час.

Дарэмна нам ужо старацца
У мітусні пустой бясконцай,
Нам ночку ў лесе пратрымацца,
А раніцой наш компас – сонца.

Так цяжка, прыкра на душы,
З сабою хлебца б нам кавалак,
Ды хоць патыліцу чашы,
Мы ў лесе нават без запалак.

Мы спалі, нібы партызаны,
Сярод дубоў, ялін высокіх,
Хто нерухома распластаны,
А хто спалохана, з падскокам…

Х Х Х

Вада і вёслы – вось забава,
Калі ты небу, сонцу свой,
Калі цябе вітае брава
Ракі разгорнуты сувой.

Калі ў характары ты здольны
Бясконца полымем згараць,
Калі ляціш душою вольнай

Рачныя мілі пакараць.

Рачныя мілі – то не вёрсты,
Калі ты ногі б’еш свае.
А тут узмах крылатых вёслаў
Разгон, дынаміку дае.

На вёслах мы ўжо дзень каторы
Працуем весела, старанна,
Ды вось рака свой дзікі нораў
Нам паказала нечакана.

Спакойна, шырака, глыбока,
Адкуль чакаць ліхой бяды?
Але ж наперадзе пратока,
Адтуль нясецца шум вады.

Пятрусь выкідвае свой палец:
Ты глянь туды, мой дарагі,
Бабры плаціну збудавалі,
Ваду пусцілі на лугі.

Падплыўшы ціха, сузіраем
На незвычайнейшы відок:
Як праз плаціну льецца, грае
Тугі, напорысты паток.

І дзіва, што плаціну тую
Звяры ўзвялі на ўзрух ракі,
Сплялі трывалую такую
Бабры, нібыта на вякі.

Сцяна з галін крывых, кашлатых,
Як дот вайсковы паўстае.
Непадалёк відаць іх хатка,

Цікава бачыць нам яе.

Стаіць нібыта на паляне
Сярод кустоў, дзе лысы ўзгорак,
А там далей, на іншым плане,
Вадой залітая прастора.

Не ўявіць нам, не прыдумаць,
Што гэта водныя звяры,
Жывёлы дзікія – не людзі
Тут цэлы комплекс узвялі.

У захапленні разам з гэтым
Мы з Петрусём не заўважаем,
Што наша лодка непрыкметна
Да вадаспада падплывае.

– Пятрусь, хапайся за альху, –
Крычу (хаця б ён мне паверыў),
А я тым часам узмахнуў
Вяслом і ўпёрся ў цвёрды бераг.

Скачу і сам хутчэй туды,
Наперад выкінуў руку,
Але, набраўшы ў рот вады,
Трапляю ў бурную раку.

Ды толькі й там (самому дзіўна)
Усёй душою я кіпеў,
Жаданнем вытрымаць плаціну,
Здаецца, вытрымаў, паспеў.

Тут у змаганні са стыхіяй
Усё, што можна, мы змаглі,
І як тады, няхай ёй ліха,

На гэты раз перамаглі.

Х Х Х

Клява гайдае нас, калыша
Па вольнай гладзі, як раней,
Мы падымаемся ўсё вышай
Да вусця свежага яе.

Далёкі шлях ты запаветны,
Сярод раскінутых лугоў
Бяжыш крывой імклівай сцежкай,
Наш водны шлях, між берагоў.

Ужо і дзень стаў больш кароткім,
І ночка дыхае свяжэй,
Не абяцае сноў салодкіх –
Бліжэй да восені, бліжэй.

Нам прапануе вечар шэры:
Турысты, свой рыхтуй начлег,
Бо непрыкметна ўжо на бераг
Туман кладзецца, нібы снег.

Мы рыхтаваць начлег павінны,
Звычайны ціхі свой бівак,
Уверсе, недзе на ляшчыне,
Вавёрка возіцца, як птах.

Яна нас нават не баіцца,
Сваім хвастом махае туга,
Той смешна сноўгае і б’ецца –
Нібы пастух гуляе пугай.

Ёй, як сабе, ахвотна веру

(Каб з тога месца не сысці)
Арэхаў поўных на вячэру
Няйначай хоча там знайсці.

І я тады не памыліўся:
На галаву мне градам колкім
Настырна, з выклікам паліўся
Паток арэхавых асколкаў.

Але ў адказ мы засвяцілі
Касцёр гарачы, моцны свой
І на вавёрку напусцілі
Ружовых іскраў цэлы рой.

Не пакідаючы злавацца,
Малы задзірлівы звярок
У даўгу не хоча заставацца,
Шле з вышыні нам свой папрок.

Але ўжо гэта, мусіць, з лішкам,
Ты бач, нахабніца якая!
З яліны ўжо зрывае шышку
І тут жа ў нас яе кідае.

Нам добра, весела і дзіўна.
Вавёрка, зноў што-небудзь выкінь!
Было так хораша, прыемна,
Што не адны мы ў лесе дзікім.

Так, не адны былі тады,
Мы не адны – на самай справе,
Хоць не чакалася бяды,
Яна з’явілася на яве.

За поўнач, мусітка, было,

Як на рацэ агеньчык бліснуў,
“А можа, у тым баку сяло?” –
Падумаў я і вочы сціснуў.

Расплюшчыў зноў – няма агню,
Няйначай гэта падалося,
Цяпер напэўна я засну
Спакойна сном сваім глыбокім.

Аднак, нібы на тое ліха,
Сон не прыходзіць да мяне,
А на душы зусім не ціха,
Агеньчык з цемры лье і лье.

Вунь ён варушыцца, мільгае,
Згасае быццам ад вятроў,
Ды зноў упарта ўзнікае
Між палахлівых чаратоў.

Я сябрука будзіць спрабую,
Яго варушачы руку,
Той не адразу, але чуе:
– Пятрусь, зірні ты на раку.

Цяпер мы ўжо глядзім абодва
Ў той бок. Агеньчык як бы знік,
І хоць зусім неверагодна,
Пачулі нейкі ціхі ўскрык.

Пятрусь мне ў твар глядзіць трывожна,
І я лаўлю ягоны позірк,
Таксама нейкі насцярожаны:
– То, можа, крык аб дапамозе?

Пятрусь схапіўся за ліхтар,

Гучыць ягоны голас строга
Загадам бегчы на пажар:
– Хутчэй, хутчэй на дапамогу!

Бяжым уночы з ім да рэчкі,
Дзе ні дарогі, ні святла,
Вясло хапаю я ў спешцы,
Бо мне нязручна без вясла.

Бяжым мы з ім – адлегласць з гакам,
І тут ля самае вады
На нас накінуўся сабака,
Жахліва нам было тады!

Я настаўляю самапал,
Фіціль успыхвае імгненна,
Нібы з гарматы грымнуў стрэл.
Упаў сабака здаравенны

Вунь ён з прабітай галавою,
Сам у агоніі страшэннай,
Увесь, сцякаючы крывёю…
Застыла бурбалкамі пена.

На нас сабака больш не гаўкаў,
Ён у траве ўжо спруцянелы,
Смярдзіць навокал тухлым яйкам.
Да рэчкі мы падходзім смела.

Пятрусь наперадзе і моўчкі
Ліхтар на рэчышча наводзіць,
Перад сабою сярод ночы
Мы бачым сетку ў цёмным бродзе.

– Глядзі, Пятрусь, там чалавек…

Ды як вачам было паверыць?
У сетцы той, не бачыць век,
Ляжаў заблытаны тапелец.

– Пятрусь, дык гэта ж сам Крумкач,
Які, раскідваючы сетку,
У ёй заблытаўся, ты бач? –
Што ні кажы – выпадак рэдкі.

Не панікуючы, без слоў,
Без рухаў лішніх і прымерак,
Пакарыстаўшыся вяслом,
Мы сець выцягваем на бераг.

Трывогі цяжкай не ўняць,
Яе не мець бы лепш да веку –
Мы неадкладна ратаваць
З Пятром пачалі чалавека.

Але ж не ўмеем каля рэчкі
Адказнай справаю займацца,
Мы, безгаловыя авечкі,
Паміж сабой давай спрачацца.

– Пятрусь, за ногі ты бяры,
Пакуль хвіліначка ў запасе,
Бо так вучылі дактары
Калісьці нас на класным часе.

Падымем, выліць каб ваду,
Што ў лёгкіх зараз у тапельца,
Я потым рукі прывяду
Ў рух. Паслухаем і сэрца.

Яго старанна мы трасём,

То на карысць пайшла “нарада”
Нам тут нарэшце з Петрусём,
Дайшлі мы з ім-такі да ладу.

Тапелец наш не божы дар,
Адчуў я гэта тварам:
Ён прыкра дыхаў мне ў твар
Смярдзючым перагарам.

Пасля блукаў вачмі вакол,
Відаць, шукаў сабаку.
Тады – о жах, які прыкол! –
На нас ён рынуўся ў атаку:

– Вы што ўначы рабілі тут?
Жуллё, бандыты, тарбахваты,
Я на бацькоў падам у суд
Ды ўпяку і вас за краты!

Маць вашу так!
Маць вашу гэтак!
Вы развялі ў рацэ бардак,
Вы панаставілі мне сетак!

Што, нацкаваць на вас Быка?
Прад ім і смелы струсіць,
Ды ўжо ж няма, цецерука,
Дадому ўцёк ён, мусіць.

Але чамусьці сам тады
Ён кінуўся на ўцёкі,
Падумаць толькі, і куды?
Падаўся ў лес высокі.

Знікалі гукі ў кустах –

Сляды ліхой пачвары,
Усхапіўся чуйна сонны птах
І месяц знік за хмарай…

Х Х Х

Бавай жа ты, прывал наш горкі,
Аб тым сава хай не рагоча,
Ён пачынаўся ў нас з вавёркі,
Ды стаў зусім бяссоннай ноччу.

Усё, што здарылася тут,
Схавалі ноч, вады патокі,
Але ж яшчэ ёсць божы суд,
Сам Бог – суддзя яго высокі.

Ледзь толькі раніцу замгліла
Ад белі высыпаных рос,
Мы пакідалі тут магілу:
Даруй ты сёння нам, барбос.

І хоць ужо зусім няважна
Казаць што-небудзь тут цяпер,
Ды бараніў ты безразважна
Гаспадара – як дзікі звер.

Таму і выйшла ўсё спантанна,
Аб тым нам суджана тужыць.
Табе зямля наканавана,
Ды ён затое будзе жыць.

Мы пакідалі свой начлег
Без гаманы, без слоў узнёслых,
І неўзабаве на Кляве
Быў чуцен плёскат нашых вёслаў…

Мінула некалькі начэй
Такіх вось дымных, пад загадку,
Але без слёзаў для вачэй,
У душы без горкага ападку.

І я, працуючы вяслом,
Тут для сябе адкрыў між іншым,
Што існуе на свеце зло –
Мне гэта ўжо было залішне.

Мацней за намі пісягі
Па хуткай гладзі пралягаюць,
Цясняцца бліжай трыснягі,
Ад нас прастор сабой хаваюць.

Мы разумелі, што Клява
Пакажа хутка свой выток,
Дык вандравалі не здарма,
У тым і ёсць вялікі толк.

Даўно няма тых вольных плёсаў,
Што сустракалі нас раней,
Куды глядзеліся нябёсы,
Дзе рыба плавае вальней.

Ды што казаць: вунь наша лодка
Трэ ў цеснаце свае барты,
Нібы самотная лябёдка,
Што знікнуць хоча ў чараты.

Мы пачалі вачамі мерыць
Раку і пільна прыглядацца,
Дзе выбраць зручны чысты бераг,
Каб на ваду больш не вяртацца.

А тут і вечар ціхай песняй,
Яму адному толькі ведаць,
Дзе дым начлежніцкі павесім,
Дзе раніцою будзем снедаць.

У даўгу дымок не застаецца,
Выводзіць лінію сваю,
Я да кастра прысеў пагрэцца
І пухлы дзённік дастаю:

“Апошняй ночы дым свой ловім,
А заўтра ўжо выходзім пешкі
Ў паход туды, дзе вецер волен.
Вадой заліўшы галавешкі,

Я запісаў радкі такія
І вочы ў роздуме закрыў.
Брады ўсе, віры глухія,
На рэчцы кожненькі разліў –

Усё закруцілася на месцы,
Нібы ва ўскораным кіно.
Чамусь не хочу нават есці,
Хаця не еў ужо даўно…

А вось і ранак з-за ракі
Ўстае, здаецца, у дзесяць сонцаў.
Бярэм з сабою рукзакі
І крочым берагам бясконцым.

Мы – недалёка ад сяла,
Як шыльда сведчыць, гэта Клёўка,
Дык вось чаму ты ў нас Клява
З такой прыгожай назвай, звонкай!

Далей мы берагам ідзем,
Пільнуем водную дарогу,
Якая нас усё вядзе
І па якой плылі так доўга.

Яна як дзіва дарагое,
Пятляе крута між алешын,
Паўз хмызнякі, куп’ё тугое,
Душу казыча мне і цешыць.

І мы спакойныя: не зблудзім,
Няхай лясун на нас раве,
Мы хвалявацца больш не будзем,
Бо давяраемся Кляве.

Клява – выдатны правадн ік,
Яна надзейная сяброўка,
Пры ёй не трапім у тупік,
Мы з ёю вернемся да Клёўкі.

Шыбуем лесам, хмызнякамі,
Ужо сонца хіліцца на вечар,
Адно жаданне толькі з намі,
Але пакуль хваліцца нечым.

– Клява, Клява, скажы мне прама,
Ты дзе хаваеш свой выток? –
Бы з навальніцы, нечакана
Як стрэліў, выгукнуў Пятрок.

– Ды вунь ён там, глядзі, мудрэц! –
Я паказаў на берасцяны
Старанна зроблены карэц,
А сам ад шчасця нібы п’яны.

Карэц узяў я, нахіліўся,
Вады набраў з крынічкі той,
Адкуль клубок празрысты біўся,
Што ўдалячынь пабег Клявой.

– Пятрусь, ты мне цяпер даруй,
Сваю душу навошта раніш?
Папі вадзіцы, не сумуй,
Тады напэўна мудрым станеш…

ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

Ужо і восень на двары,
Яна нібыта чарадзейка.
А сёння ў школьнай дзетвары
Ідзе ўрачыстая лінейка.

Раўняцца сказана на флаг.
Зайгралі голасна гарністы,
А потым стала ціха так
І незвычайна ўрачыста.

Застыў іх строй, як перад бітвай,
І як заўжды, на гэты раз,
Даўно завучанай малітвай
Гучыць тут школьнікам наказ.

На курс вучобы йдзе наводка,
Але ж звярніце вы ўвагу:
Пры гэтым бачная і лодка
На іншым плане крыху з фланга.

Якая лодка – не сакрэт,
Лічы, з легенды тая “брычка”,
Яе трымае пастамент,

На ім красуецца таблічка:

“Алесь, Пятрусь на гэтай лодцы
Кляву хадзілі пакараць.
Хвала адважным, смелым хлопцам!”
Ім пажадана: “Так трымаць!”

А дзённік той, сказаць да слова,
Як гэта сёння ні забаўна,
На класны час не выпадкова
Запланаваў пасля настаўнік.

АГНЯВЫ РУБЕЖ
(паэма)

Народнаму пісьменніку БССР
Ваілю Быкаву.

У журбе дажджом аж неба плача –
Узмакрэлі шынялі салдат.
Ставіць тут вайсковую задачу
Ў бінтах, паранены камбат:

Занімаць пазіцыю вам, браццы.
Хай зямля пад ворагам гарыць –
Неабходна хутка акапацца,
Каб агнём дарогу перакрыць.

Капітан тады быў нешматслоўным.
Пачарзе паціснуўшы дапонь,
Даганяць пайшоў сваю калону –
Баявы стралковы батальён.

Аддаляўся батальён паволі
Ў цішыню трывожную вайны,

І душа сціскалася ад болю,
Затухалі позіркаў агні.

Сіратліва пад шатром нябёсаў
Выглядала група прыкрыцця,
Быццам людзі кінутыя лёсам
На ўзмежак смерці і жыцця.

Быў пры іх прыдзірлівы і строгі
Кім Крылоў узводны старшына,
І загад быў перакрыць дарогу.
А яшчэ – крывавая вайна.

Старшына акінуў групу вокам:
Што застылі, нібы каравул!
Вам напомню: немец недалёка.
Ці загаду хтосьці не пачуў?

Ты хіба падобны на ваяку? –
Ён салдата кпіўна дакараў, –
Можа, немец прывязе на танку
Інвентар і суне ў рукаў?

Не дайшло табе, баец Сіроцін,
Хоць дайсці належала ўдвайне:
Ты салдат, знаходзішся на фронце,
.Як і ёсць – на фронце, на вайне.

Наш Крылоў ката не майстар мучыць, –
Хтось з байцоў пасля прагаварыў.–
Як з абоймы словам б’е калючым.
Не ўзводны – а зубны нарыў.

Без прымусу, са стараннем вязкім,
І вайне жадаючы “капут”,

Хто лапаткай, кацялком ці каскай
Тут байцы ўгрызаліся ў грунт.

Вышай даху клопату ў Крылова:
Свой акоп да ночы ўмацаваць,
А калі яшчэ сказаць да слова,
То паспець ля іншых пабываць.

Ля самотнай змуражэлай броўкі,
Той, што вецер іншы раз кране,
Чутна, ціха шоргае рыдлёўка
Ў акопе недзе аж на дне.

Абяцаю, немцу будзе гора,
Калі той папрэ на мой акоп,
Не паспее даць адразу дзёру,
То, глядзіш, адваліцца, як клоп, –

Так Сунічны жартаваў імпэтна,
Як яго ўзводны напаткаў,
Бы на зборах недзе мірным летам
Ён акоп глыбокі той капаў.

Не з вайной, салдат, такія жарты.
Калі грымне ў твар табе яна,
Вось тады дапрэш, чаго ты варты, –
Запярэчыў слушна старшына.

Ды падаўся досыць адмысловым
Камандзіру дбайны той салдат –
У яго акопе ўжо гатова
Нават ніша для ўзрыўных гранат.

На такога можна спадзявацца,
Хоць не проста і было змагчы,

Ён умела здолеў акапацца, –
Думаў Кім, таропка ідучы.

А Сунічны вырашыў, што хопіць
Тут бясконца корпацца ў зямлі,
Як відаць, не з тых быў гэты хлопец,
Што ў свой час ідэйнымі раслі.

Ён сачыў уважліва за часам,
І нарэшце плюнуў у пясок.
Языком прыцмокнуўшы са смакам,
Згроб у рукі рэчавы мяшок.

І пабеглі думкі гарачэй,
Як адчуў тугі ў пальцах вузел:
Будзе спаць наеўшыся ямчэй,
Чым на хілым і галодным пузе.

Не паспеў аднак прагнаць і сліну,
Як пачаў завязваць зноў мяшок.
Улавіўшы вухам страляніну,
Ледзь не ўпаў адразу ён у шок…

Не ва ўсіх ідзе работа гладка
Тут, хаця прыспешвае вайна.
Хтосьці бач сумуе без лапаткі –
Да яго спяшае старшына.

Не ўтрымаўся ён ад камплімента,
І сказаў ачкарыку пасля,
У мінулым з выгляду студэнту:
Нам з табой не быць без рамясла.

Вунь мая на брустверы лапатка –
Забірай і топай да мяне.

Пастарайся, Янкель, акапацца,
Ты ж цяпер таксама на вайне.

Будзеш ты знаходзіцца ў дазоры, –
Узводны кінуў позіркам удаль.
– Вунь адтуль чакаецца, пагроза,
Дык увагі з поля не скідай.

На вайне падобнае не нова:
Нібы з даху мокрага капеж,
На ўскрайку лесу паступова
Выяўляўся агнявы рубеж.

х х х

Вечар. Цемра цішыню накрыла,
У сон трывожны ўпала далячынь.
Толькі кроў пульсуе ціха ў жылах,
І пачуцці будзіць гарачынь.

Не салдаты на вайне, а сэрцы.
Сэрцам вечна мучыцца, шчымець,
Бо яны не здольныя памерці –
Узарвацца ці закамянець.

Старшына – вайны шалёнай рыцар,
З кулямётам цяжкім на плячы
Набліжаўся да сваіх пазіцый
Падбадзёрыць, словам памагчы.

Раптам стрэлы бліскавіца ў небе –
Старшыну ахоплівае жах:
Гэта ж пастка, горш і не патрэбна,
Пачалі фашысты акружаць.

Як магло падобнае адбыцца? –
У здранцвенні знерухомеў ён. –
Надвячоркам, зняўшыся з пазіцый,
У той бок адходзіў батальён.

Старшыну байцы чакалі моўчкі:
Што цяпер ім скажа камандзір?
І Крылоў са словамі: браточкі,
Не спаганім воінскі мундзір!

Неабходна нам злучыць акопы
Рвом агульным з брустверам крутым.
Не паспеем – позна будзе потым
Шкадаваць расчулена аб тым.

А Сунічны не жадаў мірыцца:
Што вярзеш, падумай, старшына!
Да сваіх не здолеем прабіцца.
Нам кранты, узводзіку хана.

Адступіць пакуль яшчэ не позна, –
Узвыў Сунічны гучна і замоўк.
У кулак закашляўшы пагрозна,
Ён вачамі бліснуў, як той воўк.

Разумееш, што табе належыць?
Кулю ты, лічы, сваю знайшоў, –
Старшына прамовіў, як адрэзаў,
Аглядаць пазіцыі пайшоў.

х х х

Адкуль з’явілася асоба –
Здзічэлы, чэрствы чалавек,
Чаму зрабіўся нізкапробным

Ва ўзбунтаваны гучны век?

На вёсцы рос, дзе гэткіх многа,
Заўзятым, шчырым дружбаком,
Ды неўзабаве той нябога
Зрабіўся круглым сіратой.

Бацькоў як ворагаў народа
Ўлада выслала ў Сібір.
У дзеда рос Сунічны Фёдар,
І ў школку сельскую хадзіў.

Вучыцца б далей, выйсці ў людзі,
Жыццё – бурлівая рака.
Але ізноў, як стрэл у грудзі:
Няможна сыну кулака!

Сунічны дбаў, узводзіў гмахі,
Утрапёны ў працу, і жыццё
Жыў для грамадства ён з размахам,
З душой шырокай, з пачуццём.

Быў камсамол у хлопца марай,
Ды лёс і тут яго ўкусіў.
Як прыгавор, як злая кара,
Гучала зноў: кулацкі сын!

Вось так і жыў з сваёю крыўдай
У душы затоенай на ўсіх,
Уласна кажучы, як быдла –
І не нармальны, і не псіх.

Куды б далей падаўся Фёдар –
Мне што сказаць на гэты конт?
Але пайшоў вайною вораг,

Яго адправілі на фронт.

х х х

Як па грудзях, вайна хадзіла –
Стральба вакол, свінцовы град,
Трывога душы ледзяніла,
На вуснах пеніўся загад:

На маршы нашым батальёнам
Каб забяспечыць адыход.
І біцца. Біцца хоць да скону,
Усе агнявыя сродкі ў ход!

Свідруюць думкі галаву
Да знемажэння ў старшыны.
Душу на часткі рвуць яму,
Нібы кашмарыстыя сны.

Магчыма з раніцы ў бой,
А хто яны, што йдуць змагацца?
Не задаволены сабой
Крылоў гатовы ўзарвацца.

Ці куля ворага праб'е,
Ці паляціць у танк граната? –
Патрэбна ведаць, хто твае,
Такія розныя салдаты.

Ён разумеў: не ўсё ў парадку.
Узвод свой мала ў бой вадзіў,
Не дзіўна, у гэтакім выпадку,
Які пасля ты камандзір.

Усплыў у памяці Сунічны –

Халодны коўзкі, нібы морж.
У лепшым разе трус панічны
Ці здраднік, можа, што найгорш.

Піліп Сіроцін непрыглядны.
Ён не каштуе калача,
І нерашучы, нейкі чванны,
Няма адкрытасці ў вачах.

А вось якіх перакананняў
На справе гэты чалавек,
Ці стойкіх ён выпрабаванняў?
Не здаўся б ворагу на здзек.

Калі пра Янкеля, то зноўку
Нішто не ведама яму.
Хоць раз ці стрэліў ён з вінтоўкі
За ўсю з фашыстамі вайну?

У вачах ні злосці, ні абману,
На твары толькі дабрата.
Залішне мяккі, хоць на рану
Кладзі яго замест бінта.

Сам ён у тым не вінават,
Але навокал жа вайна.
Ох, не салдат ён, не салдат, –
Уздыхае сумна старшына.

Не гаваркі, больш задуменны –
Шмат бачыў гэткіх на вяку.
Ды на вялікае здзіўленне
Трымае кнігу ў рэчмяшку.

І Крыт ва ўзводзе тып адмоўны.

Асоба з плямай – Крыт Кузьма:
Нячэсным быў ён, жыў шыкоўна –
Заслон паставіла турма.

Дзе працавў тады, на базе,
У яго магчымасці былі,
Якія, праўда, не адразу
Да крыміналу прывялі.

Загнаў ён скрынку маргарыну.
Адразу грошы прыплылі,
Далей было, як быць павінна:
Ўжо рэйсы “левыя” пайшлі.

Хады ўсе ведаў ён, як быццам,
У справах блытаных тады,
Ды колькі шнурыку ні віцца…
На зону сеў на тры гады.

То, можа, крыўда на Саветы
Глыжэ турэмніка Кузьму.
Калі на прынцып, то праз гэта
І зброю нельга даць яму.

А хто Лявон Стрыжок ва ўзводзе? –
Яму сталець яшчэ, расці.
Шкада, шкада, хлапцу выходзіць
Няма далёка дваццаці.

На зборным пункце год дабавіў,
Туды патрапіць – здому ўцёк,
У строй нагу сваю паставіў,
Са зброяй – хуценька на фронт.

Свяжэйшы факт: зусім нядаўна,

Калі ў паветры ўзвыў фугас,
У Стрыжку Крылоў убачыў яўна
Салдацкай вытрымкі запас.

Так думаў ён, удзельнік Фінскай,
Крылоў – узводны старшына,
А недзе там, за дальняй выспай,
Драмала грозная вайна.

х х х

Ужо ўсё, адваяваўся,
Няхай як-небудзь без мяне, –
Сунічны пільна паўзіраўся.
Заўважыў: хутка днець пачне.

Вінтоўку выкінуў на бруствер,
Упёрся туга ён рукой,
Затым падскочыў, гушкананўся,
З натугі фыркнуўшы, як конь.

Зрабіўшы першы крок “да волі”,
Ізноў паслухаў, думкай знік:
Якая дрэнь, дзярмо іх доля! –
Падумаў ён у бок сваіх.

Пасля папоўз, цягнуўшы ногі,
Пакуль на месцы аж не лёг.
Устаў ля самае дарогі,
Шпурнуў вінтоўку ў быльнёг.

А Янкель ноччу ў сакрэце
(Акоп з пяшчанаю сцяной),
Нібы адзін у цэлым свеце
Стаяў прыдуманы вайной.

Пачуўшы шоргат на дарозе,
Салдат заспаны твар узняў.
І скамянеў ягоны позірк,
Калі Сунічнага пазнаў.

А той пачуўшы раптам з ночы
Вайной адточанае: стой,
Ад нечаканасці падскочыў,
Забалбатаўшы: свой я, свой.

Аднак баец наставіў зброю,
(Закрыўся ляснуўшы затвор)
І бы не ў згодзе сам з сабою,
Ён стрэліў здраднiку ў упор.

х х х

Днець пачынала неадхільна,
Туман курыўся ў палях.
У гэты час атрад мабільны
З сяла высоўваўся на шлях.

Калона немцаў, як вужака,
Паўзла марудна па гразі.
І ні засады, ні атакі
Адтуль прадбачыць не маглі.

Мінулі з добрай паўдарогі,
Калі салдат матацыкліст,
Спыніўся, уз'ехаўшы на ногі –
У замяшанні быў фашыст.

Відок падзейнічаў не дужа,
Збянтэжыў толькі, не спужаў:
Была прад ім разліта лужа,

Там труп Сунічнага ляжаў.

А над каляскай матацыкла,
Падняўшы фетравы каўнер
І твар агідліва скрывіўшы,
Тырчэў, як штурла, афіцэр.

Відаць, такая перашкода
Не вельмі ўсцешвала яго,
Зірнуў дакорліва на Клода –
Мотавадзіцеля свайго.

Ды раптам збоку грымнуў выстрал,
Гер афіцэр у момант злёг.
Але чарга матацыкліста
Уклала Янкеля ў быльнёг.

Было відаць, як на далоні,
Што ўся ўзброеная раць
Замітусілася ў калоне
І пачала манеўраваць.

Фашысты меры прадпрымаюць,
Бо ў калоне іх затор.
З пазіцый бачна, выстаўляюць
Наперад бронетранспарцёр.

Ізноў далей паўзе калона
Іх франтавых армейскіх сіл
Са звонам, грукатам і стогнам
Дарогай гразкай пад ухіл.

А там – масток, бы кім забыты –
Насціл з драўляных кругдякоў.
Крылоў дае каманду Крыту:

Гэй, бронебойшчык, будзь гатоў!

Маліся, гад! Задам я перцу, –
Страшыдлу ўзяўшы на прыцэл,
Стралок павёў са злосцю ў сэрцы
Яго на мосцік на расстрэл.

І трапіў немец, як у нерат,
Між транспарцёрамі двума:
Няма шляхоў яму наперад,
Назад дарогі ўжо няма.

Матацыклісты ў адчаі –
Адгэтуль мала хто ўцячэ
З варожай вылюдкавай зграі.
А кулямёт сячэ, сячэ.

Ён аж нагрэўся ў Крылова,
Бо на фашыстаў мае злосць.
Ляцяць прабітыя галовы,
Нібыта з плахі на памост.

А транспарцёр, каторы ззаду,
Манеўр пачаў на разварот.
Ды, як ударыў Крыт па гаду,
Быў дым і копаць, і смурод.

Стрыжок азартна біў з вінтоўкі,
Быў рад, што кулі слаў у цэль.
Нібы ў момант трэніроўкі,
Лічыў свой кожны ўдалы стрэл.

Крылоў гукнуў: знішчай іх, гадаў,
А я табе дапамагу!
Прыпаў шчакою да прыклада
І выдаў доўгую чаргу.

Але ж ён бачыў, што Сіроцін
З вінтоўкай штосьці не ў ладах,
Не прагрымеў жа стрэл ніводзін.
А вось Стрыжок – бабах ды бах!

Уцяклі, каму пашанцавала,
Але ж буйны свінцовы град
Панішчыў ворагаў нямала,
Палёг амаль увесь атрад.

Патроны ўзяць, праверыць зброю! –
Каманда ўзводнага гучыць. –
То ж дзякуй немцу, што без бою
Дае хвіліны адпачыць.

Скажы, Сіроцін, страшнавата?
Але ж вунь колькі мёртвых цел!
Табе належыць як салдату,
Глядзець на ворага ў прыцэл.

Патрон заела ў затворы, –
Сіроцін хмурыўся, як ноч.
Пасля не вымавіўшы слова,
Свой позірк выкінуў на ўзбоч.

Стаяў, крывіў нязграбна плечы,
Ад старшыны сакрэт хаваў.
Ён замарочаны быў нечым,
Як што згубіў, або ўкраў.

Я не хачу… мне жыць ахвота, –
Заенчыў раптам, бы шчанюк, –
Нас колькі ёсць? Была б хоць рота.
Інакш усім нам тут – каюк.

Сунічны недзе ўжо далёка –
П’е сыradой цяпер са жбана,
І ваш загад: назад ні кроку
Яму ўжо да барабана.

Ты на вайне, баец Сіроцін,
Лічы, што здрадніка сустрэў.
Такіх, як ён, цяпер на фронце.
Бясспрэчна ставяць пад расстрэл, –

Казаў Крылоў. А там па ямках,
Йдучы ізноў у жорскі бой,
Крыжом пазначаныя танкі
Вялі пяхоту за сабой.

Ішлі машыны з набліжэннем,
Ужо гук матораў чуцен тут.
Тым, хто знаходзіўся ў траншэі,
Быў зразумелы іх маршрут.

Дае параду ўзводны Крыту:
Чакай пакуль. Цярпі, Кузьма.
Цяпер, лічы, іх карта біта,
Назад дарогі ўжо няма.

Ды бранябойшчыка не трэба
Вучыць ліхому рамяству.
Яму цяпер, як з’есці хлеба,
Дай зняць фашысту галаву.

Ён сочыць з вытрымкай, спакоем,
Як кот, палюючы на мыш.
Затвор пад цвёрдаю рукою,
Выразна вока бачыць крыж.

Пярэдні танк хаця спакойны,
Ды, быццам чуе свой канец.
Так вол сляпы ідзе на бойню:
Нібыта ногі не свае.

На мост завалены металам –
Фашысцкім бітым барахлом
Успоўз нарэшце ён памалу,
Упарта ўпёрся ў транспарцёр.

Спіхнуць спрабуючы ў канаву,
Пад выстрал свой падставіў бок.
І тут жа пасмамі рухава
Усплыў над башняю дымок.

Нібы вайны авантурысты
З зайздросным спрытам дзікуноў
Праз люк выскоквалі танкісты,
Зляталі ў паніцы далоў.

Уцячы нікому не ўдаецца,
Бо кулямётчык не ў даўгу.
Ізноў “дзяхцяр” ажно трасецца,
Ім пасылаючы чаргу.

Гарыць сталёвая махіна,
Аднак другі такі ж дракон
Павёў сваім ствалом – яхідна,
Адтуль жа выбухнуў агонь.

Фашыст з разлікам біў, дакладна,
Страляў па–снайперску, як брыў.
Наступным пушчаным снарадам
Ён бранябойшчыка накрыў.

І старшына сцякаў крывёю,
Панік на бруствер галавой.
Шапталі губы: к бою, к бою…
Ён паміраў, быў сам не свой.

Крыт апрытомнеў, думкі ўзважыў,
Хоць галаву было не ўзняць:
Фашыст! За ўсё цяпер адкажаш, –
Ён пэтээр спрабуе ўзяць.

Ружжо пашкоджана асколкам,
Яно – нікчэмная ўжо рэч.
Стралок тады адкінуў толькі
Ламаку выгнутую прэч.

А танк – сталёвая звярына,
З гарматы раз за разам б’е.
І кулямёт адтуль няспынна
Шле чэргі доўгія свае.

Тады дзве цяжкія гранаты –
Сабе ў рукі па адной –
Бярэ Кузьма, паўзе да танка
Па полі вязкай баразной.

Уздрыганула наваколле,
І пацямнела нават днём.
Падскочыў лес так, як ніколі
І танк ахоплены агнём.

Рашылі тыя, у трэцім танку:
Навошта зноў дражніць гусей,
Без іх крыжастай катафалкі
І так тут шмат ужо касцей.

У зваротны бок здала машына,
Матор натужліва ўзвыў –
Клін толькі можна выбіць клінам. –
Фашысты хлынулі ў тыл.

Для іх уласныя галовы
Бліжэй, чым фюрэра загад.
Грымелі боты ў падковах,
Як беглі ў паніцы назад.

Стрыжок дарэмна час не бавіў,
З сабой на фронт не браў тугу.
“Дзяхцяр” на бруствер ён паставіў
І даў па ворагах чаргу.

х х х

Сіроцін зняў з сябе падсумак,
І зброю з ім паклаў у рад.
Рабіў усё без лішніх думак,
Бы старшыне здаваў на склад.

Вось гэта больш мне не належыць, –
Сказаў па–свойску ён Стрыжку. –
Я буду жыць, як набяжыць.
На развітанне дай руку.

Не хочаш нават развітацца?
Але ж, Лявоначка, бывай.
З табою лепш не сустракацца,
Бо не падзелім каравай.

Куды пайшоў? Назад, Сіроцін! –
Стрыжок слоў іншых не знайшоў, –
За дэзерцірства ты заплоціш.

Стаяць! Назад, куды пайшоў!

Зноў у Стрыжка Крылова зброя,
Без кулямёта нельга тут.
Супроць Сіроціна ўжо двое –
Суровы здрадніку прысуд!

ЗМЕСТ

Вершы

КНІГА
МАЯ КНІГА
НАШ СЦЯГ
РАЗВІТАННЕ З ЛЕТАМ
НЕБА
АРЭХАВАЯ РАНІЦА
ВЯСЁЛКА
З ПАРЫ ДЗЯЦІНСТВА
СЯСТРЫЧКА
СПЫТАЕ ЗОРКА
КОЦІКІ
ОДА ХЛЕБУ
ЗАПАВЕТНАЯ МЯСЦІНА
ВАЛЬС ВЫПУСКНІКОЎ
ЗАРА З ЗАРОЙ
ШЧУПАК
ЛІТАРАТАРУ
ГРЫБНАЯ ПАРА
КІРМАШ НА ПАЛЯНЕ
НЕНАПІСАНЫ ВЕРШ
НЕ ТАЯ ПРЫКМЕТА
МЕСЯЦ
БЯРОЗАВЫ СОК
АБЛОКІ
ПЯТРУ ПРЫБЫТКІНУ
ПРЫГАЖУНЯ
НЕВЯДОМЫ САЛДАТ
ЦЯРПЕЎ ПАПІРУС
НА ПАДЗВІГ
РАДЗІМА ХЛЕБА
КУРГАНЫ

БУСЕЛ
ЁН АБАРОНЦА
НАД БЯРЭЗІНАЙ
ПАМЯЦЬ СНОЎ
РЫБАК
ПАЭТ
ПАДАРАВАНАЯ ПАЛЯНА
ЛАЗНЯ
ЗНІШЧАЛЬНІК
ДАМОЎ З ПЕРАМОГАЙ
ШПАК
ЖАЎРУК
АПАНЕНТЫ
ВЯСНОВЫМ ДНЁМ
ПЕРАД НАВАЛЬНІЦАЙ
БАБІНА ЛЕТА
ЗІМОЮ
ГЕРОЙ У ГРАНІЦЕ
МЫ АДТУЛЬ
ЦАР-ДУБ
ВАЎЧЫЦА
ДЗЕД І КОТ
ХАЛОДНЫ ДЗЕНЬ
ЧОРНАЯ ЗАЙЗДРАСЦЬ
ЗВЯРЫНЕЦ
КРЫГАХОД
АБЯЦАННЕ
ДЗЕД МАРОЗ

Паэмы

ЭПОХА РУСАЛКІ
АГНЯВЫ РУБЕЖ

Літаратурна–мастацкае выданне

НЕСЦЯРОВІЧ Уладзімір Паўлавіч

ПАЧУЦЦІ І ПАМЯЦЬ

Вершы

Рэдактар
Т. М. Якаўлевіч

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
Л. У. Гатавіцкая

У дызайне вокладкі выкарыстаны фрагмент карціны Уладзіміра Несцяровіча "Раскіданы масток"

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E–mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by